Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыя № 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародніх — 20 к. мясцовых — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нашпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок нашпарэлі пасярэдз тэксту 1 р. — к. За радок нашпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпісныя на 50 проц. дарожэй. Зьніжкі тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрадоўж. і чырвонаармейцы за дакумант — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'ту—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 250 (2438) Нядзеля, 28-га кастрычніка 1928 г.

ГАМБУРСКАЙ СТАЧКАЙ КІРУЕ КАМПАРТЫЯ.

Сацыял-прадажніцкія шуцманы расстралялі дэманстрацыю бастуючых.

БЭРЛІН. Становішча ў Гамбурзе характарызуецца аб'яднаным наступам фармісцкіх лідэраў, сацыял-дэмакратаў і паліцыі проці бастуючых, якімі кіруюць камуністы.

У чацьвер адбылася стыхійная дэманстрацыя бастуючых ля рэдакцыі заборонеае камуністычнае газэты «Гамбургер Фолькс Цэйтунг». У зьвязку з дэманстрацыяй памяшканьне рэдакцыі было занята паліцыяй. Потым адбыўся масавы сход бастуючых у самай буйнай залі Гамбургу. Заля не зьмясьціла ўсіх удзельнікаў сходу, і давялося наладзіць роўналеглыя сходы.

Сходы паказалі гатоўнасьць бастуючых весьці далей барацьбу. Згодна загаду сацыял-дэмакратычнага начальніка паліцыі моцныя паліцэйскія атрады захапілі ваколічныя вуліцы. Спробы справакаваць бастуючых не ўдаліся.

У порце ў часе зьмены здарыліся стычкі рабочых з паліцыяй, якая праводзіла штрэйкбрэхераў на грузавіку. Паліцыя страляла. Арыштавана шмат рабочых.

«Форвэртс» адкрыта ўхваляе меры паліцыі, якія між іншым, забясьпечваюць дастаўку ў порт штрэйкбрэхераў, бо пасрэдніцкае бюро, а таксама ўваходы і выхады порту заняты паліцэйскімі патрулямі.

Камуністычная партыя Кітаю ня спыняе змаганьня.

ПЕКІН, 25-X. Пекінская паліцыя канфіскавала сьпіс 12-ці камуністычных дакладаў і прапануе жыхарству дакладна затрымаць гэтых асоб. Пекінскія дзеячы Гаміндану наладзілі 23-га кастрычніка нараду в мясцовымі рабочымі лідэрамі і перасьцерагалі іх ад дзейнасьці камуністаў, а таксама „ад абдуманага" абвяшчэньня забастоўкі.

ПЕРАМОВЫ З ЯПОНІЯЙ НІЧОГА НЕ ДАЛІ.

ШАНХАЙ, 25-X. Перамовы нанкінскага ўраду з Японіяй скончаны. Дагнут толькі нязначны посьпех. Японія згадзілася на патрабаваньне ўтварыць новы ўгавор, але тэрмін перагляду аб ім не ўстаноўлен. Спробы ўпадкаваць Цзынаньскі інцыдэнт ня мелі посьпеху.

БАЙКОТ ЯПОНЦАЎ ЗАБАРОНЕН УЛАДАЙ.

ПЕКІН, 25-X Водлуг паведамленьняў японскага агенцтва, вайсковы міністр нанкінскага ўраду Фынь-Юй-Сян прапануе ўладзе правінцыі Шандунь не звяртаць байкоту японцаў. Байкот заборонен.

ШАНДУНЬ АХОПЛЕНА СЯЛЯНСКІМ ПАЎСТАНЬНЕМ.

ПЕКІН, 26-X. Агенцтва Гавас паведамляе, што дзейнасьць «валіких камоў» ва ўсходняй частцы правінцыі Шандунь пашырылася. Яны захапілі шмат вёсак і бяруць падаткі.

ГАНДЭТНАЯ ПАГОДЖАНАСЬЦЬ.

ШАНХАЙ, 26-X. Вырашана, што нанкінская і японская дэлегацыі, якія ўдзельнічалі ў перамовах, зробяць дакład сваім урадам аб выніках перамоў і запытаюць далейшых інструкцый. Водлуг слоў агенцтва Рэйтэра, Японія згаджаецца вывесьці сваё войска з Шандуню, але патрабуе гарантыі для сваіх грамадзян на будучае. Былей абодвы бакі згаджаюцца выплаціць за страты падданым іншых краёў у выніку цзынаньскага інцыдэнту. Аб пытаньні аб тым, ці лічыць японска-кітайскі ўгавор сапраўдным, згоды пакуль-што не дасягнута.

БЛІЗІЦЦА НЯБЫВАЛЫ ЛЁКАУТ.

БЭРЛІН, 26-X. Сёньня на бэрлінскай біржы панаваў вельмі нервовы настрой. Гэты настрой быў выклікан, пераважна паведамленьнямі, што перамовы ў Рэйнска-Вэстфальскай мэталёвай прамысловасьці скончыліся бяз вынікаў. Прадпрыёмцы ў адказ на патрабаваньне павялічыць заработак назначылі на 1-га лістапада лёкаут, які ахопіць блізка 230-ць тысяч рабочых.

Клясавыя канфлікты ў Польшчы

УСЕ ПРАФЭСІІ ДАМАГАЮЦЦА ПАВЯЛІЧЭНЬНЯ ЗАРАБОТКУ.

ВАРШАВА, 26-X. Прафсаюз тэкстыльшчыкаў Цешанскае Сілезіі (прымежная з Чэхаславакіяй паласа) адмовіўся падпісаць леташні калектыўны ўгавор і патрабуе павялічыць заработак на 20 проц.

Мэталёўцы Бельскага райёну дамагаюцца павялічэньня заработку на 15 проц. і выплаты ім адначасовае дапамогі ў разьмеры 100 злотых (22 р.) для сямейных і 50 злотых для адзіночак.

СТАЧКА ГДЫНЬСКІХ МАРАКОЎ.

ВАРШАВА, 26-X. Забастоўка маракоў і транспартных рабочых у Гдыні (польскі порт у так званым польскім карыдоры) ня спыняецца. Бастуючыя патрабуюць утварыць калектыўны ўгавор, павялічыць заработак на 40 грошай (9 з паловаю капеек) у гадзіну і прызнаць прафсаюзы.

Забастоўка матросаў таксама ня спыняецца. Гэтая забастоўка мае палітычны характар, бо яна выбухнула ў выніку ўціску дзеячоў прафсаюзаў адміністрацыяй дзяржаўнага марскога параходства.

У Францыі 400 забастовак за 5 м-цаў.

ПАРЫЖ, 26-X. Адчынілася сэсія ўнітарнае канфэдэрацыі працы. У дакладзе сэкратар фэдэрацыі Манмусо зазначыў, што 400 забастовак за першых 5 месяцаў 1928 г., якія ў некаторых выпадках далі павялічэньне заработку, сьведчаць аб пераходзе рабочае клясы ў наступ проці капіталістычнае рацыяналізацыі.

ГРЫЗЬНЯ Ў ЛЯГЕРЫ ПОЛЬСКІХ САЦЫЯЛ-ФАШЫСТАЎ.

У ход пушчаны фальшыўкі.

ВАРШАВА, 26-X. Для характарыстыкі метадаў барацьбы між абедзьма фракцыямі ППС можна падаць такі цікавы факт. Гэтымі днямі ва ўсе рэдакцыі, а таксама некаторыя дзяржаўныя і грамадзкія ўстановы разасланы праз пошту выразна сфабрыкаваная адозва за подпісам ЦК польскае кампартыі. У адозве зазначана: «ЦК ППС, нарэшце, зразумеў ганебнае выступленьне сацыял-фашысцкіх агентаў і здраднікаў рабочае клясы, якімі кіруе Явароўскі, і рашыў распусьціць варшаўскі акруговы камітэт партыі. Правільнае разуменьне ЦК ППС інтарэсаў працоўных мы вітаем у імя агульнае барацьбы за міжнародную салідарнасьць пралетарыяту. Мы вітаем той факт, што ЦК ППС правільна зразумеў інтарэсы рабочае клясы, і заклікаем усіх таварышоў змагацца далей проці сацыя-апартунізму. Таварышы, падтрымліўайце правільную пазіцыю ЦК ППС».

Гэтая грубая фальшыўка была зьмешчана ў афіцыёзнай «Эпосе» і органе пілсудчыкаў «Глос Правды».

Орган ППС «Роботнік» з абурэньнем заяўляе, што адозва падроблена. У довад гэтага газэта раўнае яе з пастановамі выканкому Камінтэрну і артыкуламі маскоўскае «Правды» па польскім пытаньні. Водлуг слоў газэты, у сойм будзе пададзена запытаньне, якое выкрые шмат пікавтных падробязнасьцяў выробу гэтае фальшыўкі. Сёньня «Эпоха» таксама заяўляе, што адозва, зьмешчаная ёю, як відаць, фальшывая.

Грэцыя аднаўляе перамовы з СССР.

АТЭНЫ, 26-X. Атэнскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: «Перадаюць, што адпаведныя ведамствы падрыхтоўваюць аднаўленьне грэка-савецкіх гандлёвых перамоў».

„Фошішэ Цэйтунг" асуджвае правакацыйны крок банкіраў.

БЭРЛІН, 26-X. «Фосішэ Цэйтунг» піша: „Савецкі ўгавор з Генэральнай Электрычнай Кампаніяй зьяўляецца ўдарам адзнакаю здаровага напрамку амэрыканскага капіталу. Генэральная Электрычная Кампанія адмовілася ад сваіх дамаганьняў доўгу, каб утварыць зьдзелку, якая абяцае багатыя магчымасьці. Маскоўскі крук мае рацыю, калі процістаўляе паводзіны Генэральнае Электрычнае Кампаніі выступленьню групы нямецкіх банкіраў, якія якраз у гэты момант чамусьці палічылі патрэбным падкрэсьліць, што яны надаюць менш значэньня гарантыям Рапальскага ўгавору, чымся дапамозе заходніх банкіраў".

Леанідаў і Чэхава—народныя артысты РСФСР.

МАСКВА. У зьвязку з 30-цігадовым юбілеем Маскоўскага настацкага тэатру СНК РСФСР за плённую шматгадовую артыстычную дзейнасьць надаў званьне народных артыстаў рэспублікі Леанідаву і Кнупер-Чэхавай.

Апроч таго, званьне заслужаных артыстаў прысвоена Карацёвай, Сакаловай, Аляксандраву, Падгорнаму, Халюцінай і Шаўчэнка.

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1-й гадз. ночы).

САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫ ЗРЫВАЮЦЬ ГАМБУРСКУЮ СТАЧКУ.

БЭРЛІН, 27-X. Надзвычайнае ўзмацненьне паліцэйскага тэрору, а таксама штрэйкбрэхерская тактыка сацыял-дэмакратаў прымусіла гамбурскіх партовых рабочых спыніць стачку, абвешчаную ў адказ салідарнасьці з докерамі, а таксама ў абарону ўласных эканамічных патрабаваньняў.

Памёр стары бальшавік тав. Семкоў.

МАСКВА, 27-X. Прэзыдыум ЦКК УсеКП(б) паведамляе аб сьмерці старога бальшавіка, члена ЦКК, кандыдата ў Прэзыдыум ЦКК УсеКП(б) т. Семкова, Сямёна Майсеевіча, які памёр 27 кастрычніка а 5-й гадз. раніцы ў Ленінградзе.

Пад сьцягам рэвалюцыйных традыцый бальшавізму.

ЛЕНІНСКІ КАМСАМОЛ СУСТРАКАЕ НОВАЕ ДЗЕСЯЦІГОДЗЬДЗЕ.

За буднямі будаўніцтва ён абяцае не праглядзець вялікіх задач пралетарскае рэвалюцыі.

МАСКВА. У зьвязку з надыходзячымі 29-га кастрычніка 10-мі ўгодкамі камсамолу, ЦК УсеЛКСМ зьвярнуўся да ўсіх камсамольцаў і да ўсяе працоўнае моладзі з такою адозвай.

Таварышы! Зямлю, заводы, капальні і ўладу заваявала старэйшае пакаленьне рабочых і сялян. Стачкамі, войнамі, паўстаньнямі, ссылкамі, крывёю і мясам працоўных выбрукаван шлях да Кастрычніка. Арганізатарам і натхніцелям паўстаньняў, правадыром стачак і рэвалюцыйных рухаў на працягу ўсіх трох рэвалюцый была і ёсьць партыя бальшавікоў, партыя рабочае клясы.

Сучаснае пакаленьне камсамольцаў ня ўдзельнічала ні ў кастрычнікавым паўстаньні, ні ў грамадзянскай вайне. Шмат-хто з нас вырас у гады НЭП'у. Мы карыстаемся правамі, здабытымі ў Кастрычніку. Мы ня памятаем іншага дзяржаўнага ладу, апроч савецкага. Мы прышлі на заваяванае. Для нас рэвалюцыя—быт, для нас будаўніцтва сацыялізму—штодзённая праца.

Зараз, аглядаючыся назад, на ўвесь мінулы 10-цігадовы шлях, мы гаворым сабе: мы згартаваны крывёю в клясаю і партыяй. Мы зьвязаны адзінаю мэтаю—маладыя і старыя пакаленьні бальшавіцкае сям'і. Ордэнам Чырвонага Сьцягу,—вышэйшаю баявою ўзнагародаю рэспублікі—адзначана стойкасьць і адвага камсамольцаў на франтох грамадзянскае вайны. Мы абавязаны здабыць другі за барацьбу на франтох працы і культуры.

Кулакі, нэпманы, шкоднікі, бюракраты спрабуюць раскалоць сувязь рабочае клясы з сялянствам, распаліць нацыянальную варожасьць між народамі Савецкага Саюзу. Яны разбэшчваюць і развальваюць асобныя клетачкі савецкага і партыйнага арганізму. Асабліва востра імкнуцца акруціць яды моладзь. Памощнікі іх—абываталькая бяз'ідэёвасьць, палітычнае крахаборства, замірэньне з клясава-варожай ідэалёгіяй. Іх ворагі—вакуўічы матар'ялізм, тэорыя рэвалюцыйнага дзеяньня, рэвалюцыйныя традыцыі бальшавізму. Падрастаючае пакаленьне пралетарыяту абавязана стварыць шырокі тэарэтычны рух сярод моладзі, выхаваць моладзь у незамірымым клясавым духу, узброіць яе рэвалюцыйнай тэорыяй марксізму.

Усё нашае будаўніцтва і ёсьць клясавая барацьба.

У штодзённай працы на фабрыках і ўстановах, на ўсіх вучастках будаўніцтва ў нас адбываецца змаганьне між старым і новым гаспадарчым ладам, між савецкімі і капіталістычнымі элемэнтамі ў нашай гаспадарцы. Мы павінны ўмець размножваць храсткі новага, сацыялістычнага, умець «выгручваць нягоднае, навучацца ад добрага». Кожны з нас, камсамольцаў, абавязан стаць арганізатарам, прапагандыстам і барацьбітом масавага руху за культуру, за будаўніцтва, за самакрытыку ў нашым краі. Мы павінны дапамагчы партыі наладзіць самавыхаваньне пралетарыяту і перавыхаваньне, перапрабку, перанавучаньне ім клясы працоўных і сялян. З нас саміх, з усяго пакаленьня падрастаючае працоўнае моладзі мы павінны ўзрасьціць інакшы чалавечы матар'ял, стварыць інакшыя адносіны да працы і будаўніцтва. Мы павінны пабудаваць сацыялізм, мы павінны выхаваць з сябе камуністаў. Усіх вас маладых рабочых, сялян, служачых і вучняў усіх працоўных краю, дзе будуецца сацыялізм,—камсамол кліча ў культурны паход проці бруду, п'янства, неграмотнасьці, да разгортваньня культурнае рэвалюцыі ў бездарожнай, нямытай, адсталай Расеі, якая стала першаю ў сьвеце рабочаю рэспублікаю. 20-ці мілёнам напісьменных мы павінны адчыніць вочы, 150 мілёнаў людзей мы павінны навучыць жыць чысьцей, культурней і лепш.

Калі партыя ізноў кіне поклік—«край у небасьпецы», дык у нас пад вінтоўку стануць мілёны людзей, каб запрудзіць сабою шматвёрставыя фронты, каб абараніць сацыялістычную бацькаўшчыну ўсяго сьвету. Вялікія клясавыя бойкі давядзецца перажыць нам у надыходзячае 10-цігодзьдзе.

У адной шостай частцы сьвету мы будуем сацыялізм. Пяць шостых—пад абсацам імпэрыялізму. Кожны ўдар кіркаю, кожны паварот шасьцярні, кожны новы мэтр паркалю, кожная кніжка, кожны завод—гэта кавалкі нашае клясавае нянавісьці, гэта дапамога братом усходу і захаду, гэта заснаваньне моцнага тылу для будучых кагорхаў пралетарскае рэвалюцыі. Гэта гатаўка баявое амуніцыі для надыходзячых клясавых боек. І мы не забудзем, не праглядзімо за буднямі будаўніцтва вялікіх задач пралетарскае рэвалюцыі, ускладзеных гісторыяй на нашае пакаленьне. Слаўны дзесяцігадовы шлях, пройдзены камсамолам пад кіраўніцтвам партыі, гаворыць за гэта.

Аглядваючыся назад, успамінаючы мінулае, мы адважна заглядваем у будучыню і даём сабе варок: ня здрэйфіць, ня здаць ні ў штодзённай будаўнічай працы, ні на барыкадах сусьветнага Кастрычніка!

Чырвоная армія ў ногу з камсамолам у культпаходзе.

Зварот НК вайсковых спраў і РВС СССР да ўсяго чырвонааймейскага, каманднага і палітычнага складу Рабоча-Сялянскае Чырвонае арміі.

Чырвонасьцяжны Ўсесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі, у зьвязку з сваім дзесяцігодзьдзем і надыходзячым адзінаццацігодзьдзем Кастрычнікавае рэвалюцыі, праводзіць у перыяд ад 27-га кастрычніка да 14-га лістапада ўсесаюзны камсамольскі суботнік дапамогі школе. У гады грамадзянскае вайны Ленінскі Камсамол у першых шэрагах рабочае клясы грудзьмі абараняў кастрычнікавыя заваёвы проці ўзброеных банд памешчыкаў і капіталістаў.

З тым-жа ўздымам, з тым-жа неадступнасьцю і упартасьцю выступае ён цяпер на фронце вялікага будаўніцтва сацыялізму проці адсталасьці, проці забабонаў, напісьменнасьці, цемры і некультурнасьці.

Гэты новы фронт барацьбы за культурную рэвалюцыю сустракае самы гарачы водгук у радох Чырвонае арміі. Чырвонаармейцы, камандзіры і палітычныя працаўнікі добра ведаюць, што толькі ўздым агульнае культурнасьці краю, толькі распаўсюджаньне сярод моладзі агульных ведаў, толькі добрая пастаноўка савецкае школы забясьпечыць Чырвонай арміі такое папаўненьне, якое здолее дасягнуць найбольшых вынікаў у вывучэньні вайсковае справы і вайсковае тэхнікі. І з гэтае прычыны заклік камсамолу дапамагчы школе, дапамагчы народнай асьвеце, павінен знайсьці і бясспрэчна знойдзе самы гарачы водгук ва ўсёй армейскай грамадзкасьці. Таксама як на франтох узброенае барацьбы, уліваючыся ў рады Чырвонай арміі, камсамол павялічваў яе сілы, надаваў ёй бадзярасьці і веры ў перамогу, так на фронце ўпартае барацьбы за культурную рэвалюцыю Чырвоная армія цалкам і поўнасьцю павінна падтрымаць камсамол.

Рэвалюцыйны Вайсковы Савет упэўнен, што сярод чырвонаармейскага і каманднага складу ня знойдзецца ніводнага чалавека, які ня ўзяў-бы актыўнага і асабістага ўдзелу ў наладжваемым камсамолам усесаюзным суботніку. Гэты ўдзел павінен выявіцца, пераважна, у рэальнай дапамозе савецкай школе. Праца на суботніках, збор лому і іншага матар'яду, удзел у рамонце і абсталяваньні школ, наладжаньне ў спэцыяльных часьцях работы за плату з перадачаю атрыманых сум на дапамогу школе, збор сродкаў і г. д.—вось прыкладныя формы выяўленьня нашае актыўнасьці.

Яшчэ больш трэба імкнуцца да наладжаньня суботнікаў з асабовым складам дзеля рамонту і абсталяваньня падшэфных вясковых школ, адчыненьня ў іх вайсковых куткоў.

Заклікаем увесь склад Чырвонай арміі да ўдзелу ва ўсесаюзным суботніку. Рэвалюцыйны Вайсковы Савет упэўнен, што чырвонаармейцы, камандзіры і палітычныя працаўнікі зойдуць месца ў першых шэрагах барацьбітоў за культурную савецкую працоўную школу.

Нам Наркамвоен і старшыні РВС СССР УНШЛІХТ.

Прывітаньне юбіляру ад Выканкому Кім'у.

Ленінскаму Камсамолу Савецкага Саюзу.

Таварышы! Камуністычны Інтэрнацыянал Моладзі паслае сваё шчырае і рэвалюцыйнае прывітаньне Ленінскаму Камуністычнаму Саюзу Моладзі СССР у дзень яго 10-цігадовага юбілею.

З гонарам глядзяць маладыя камуністы капіталістычных краёў на самых адданых і вопытных саратнікаў у першай рабоча-сялянскай рэспубліцы. Міжнародны камуністычны рух памятае пра безьліч камунараў, якія аддалі сваё жыцьцё за ўмацаваньне дыктатуры пралетарыяту. Гераічнае мінулае камсамолу СССР, народжанага і ўзгодаванага ў агні пралетарскае рэвалюцыі, ніколі не затрэцца з старонак гісторыі пралетарскае вызваленчае барацьбы. З гэтае прычыны працоўная моладзь капіталістычных краін заўсёды будзе чарпаць новую бадзёрасьць і новы вопыт для барацьбы проці сусьветнага імпэрыялізму. З тым самым уздымам як і ў гады грамадзянскае вайны, камсамол СССР у новых умовах працягвае сваю барацьбу на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. У горадзе і ў вёсцы, на капальнях і на заводах, у сяўетах і ў школах, у арміі і флёце шматмілённая армія камсамольцаў укладае сваю частку ў будаўніцтва сацыялістычнае гаспадаркі і новае культуры дзеля ўмацаваньня і абароны адзінае бацькаўшчыны працоўных усяго сьвету.

Ленінскі камсамол дзякуючы свайму гістарычнаму вопыту, набытаму на ўсіх этапах пралетарскае барацьбы ад спасаваньня капіталізму і заваёвы дыктатуры пралетарыяту да будаўніцтва сацыялізму, арабіўся кіруючай арганізацыяй міжнароднага камуністычнага руху моладзі і зьяўляецца водпаю зоркаю для працоўнае моладзі ўсіх краёў.

Камуністычны Інтэрнацыянал Моладзі ведае, што Ленінскі Камсамол заўсёды будзе служыць апорай для камуністычнае партыі СССР, будзе і далей без вагаваньня не зважаючы на ўсе цяжкасьці, ісьці па паказаным Ленінам шляху да сацыялізму. Камуністычны Інтэрнацыянал Моладзі ведае, што ў асобе УсеЛКСМ рабочая клясы і не моладзь знойдуць адзін з лепшых атрадаў сусьветнае рэвалюцыі.

Камуністычны Інтэрнацыянал Моладзі заварае ўсіх маладых камуністаў Савецкага Саюзу, што рэвалюцыйная рабоча-сялянская моладзь у капіталістычных краёх праводзіць і будзе праводзіць нясупынную барацьбу супольна і пад кіраўніцтвам камуністычных партый, каб скінуць прыгон капіталізму, а таксама проці падрыхтоўкі імпэрыялістаў да новае вайны і да нападу на СССР. Вайну, якую імпэрыялісты і іх сацыял-дэмакратычныя памоснікі шаленна рыхтуюць проці Савецкага Саюзу, працоўныя ўсіх краёў абернуць у вайну грамадзянскую, якая вызваліць ўсё прыгнечанае чалавецтва ад ярма капіталізму.

Нахай жыве Ўсесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі.

Нахай жыве рабочая і сялянская моладзь СССР.

Нахай жыве Камуністычны Інтэрнацыянал Моладзі.

Нахай жыве сусьветная пралетарская рэвалюцыя!

ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ КАМУНІСТЫЧНАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ МОЛАДЗІ.

Гав. Дорыё ізноў на волі.

ПАРЫЖ, 26-X. Пасьля 6-цімесячнага зьняволеньня вызвалены камуністычны дэпутат Дорыё, які быў засуджан за абвінавачаньні ў антымілітарысцкай прапагандзе і арыштован у красавіку пасярэдня перад парляманцкімі выбарамі ў Францыі.

Пасьля свайго вызваленьня Дорыё выступаў на двух масавых сходах у Марыжы. Удзельнікі сходу бурна вітаюць Дорыё і патрабавалі ўсеагульнае амністыі на палітычных справах.

Праэкт „новае Лігі Нацый".

НЬЮ-ЁРК, 26-X. «Старшыня дэлегацыі ангельскіх журналістаў», які знаходзіцца зараз у Амэрыцы, Ральф Блюмэнфэльд выступіў з плянам заснаваньня «новае Лігі Нацый», куды ўвайшлі ўвайсьці толькі Англія, Злучаныя Штаты, Францыя, Італія, Нямеччына і Японія. Свой праэкт Блюмэнфэльд аснуўвае на тым, што Ліга нацый у яе сучасным выглядзе зьяўляецца «перагружанаю і бясплённаю».

Рэпарацыйны вузел.

БЭРЛІН, 26-X. Агенцтва Вольфа паведамляе: «На сёньнешнім пасяджэньні агульнанямецкага габінэту міністр фінансаў зрабіў даклад аб становішчы рэпарацыйнага пытаньня. Габінэт ухваліў ужыць супольна з іншымі заінтарэсаванымі ўрадамі належныя захады, каб ажыцьцявіць плян заснаваньня незалежнае камісіі экспартаў з мэтаю канчаткова і поўнасьцю ўпарадкаваць рэпарацыйнае пытаньне».

МІЛІЯРДНЫЯ ПРЫБЫТКІ ЗА КОШТ ЭКСПЛЁАТАЦЫІ РАБОЧЫХ.

НЬЮ-ЁРК, 26-X. Чысты прыбытак ад буйнага аўтамабільнага трэсту Злучаных Штатаў «Джэнэраль Моторс Корпорэйшэн» за 9 месяцаў бягучага году дасягнуў рэкорднае для ўсяе прадпрыемнасьці сумы ў 240.534.000 даляраў; за гэты-ж перыяд летась чысты прыбытак складаў 193.758.000 даляраў.

Польская калёнізацыя на „Ўсходніх Крэсах".

Адроджаная Польшча амаль ня з першага дня свайго новага незалежнага існаваньня пачала руплцца аб калёнізацыі польскім элемэнтам тых „сваіх" тэрыторый, якія былі этнаграфічна няпольскімі. Такімі землямі зьяўляюцца беларускія і украінскія абшары на ўсходзе сучаснай Польшчы, менш заселеныя, чым этнаграфічная Польшча. Цяпер, паводле польскай статыстыкі, у 4-х усходніх ваяводзтвах Польшчы—Віленскім, Навагрудзкім, Палескім і Валынскім пражывае 4.500.000 насяленьня. Абшар гэтых ваяводзтваў раўняецца—124.000 клм. Найслабей заселена Палескае ваяводзтва: налічвае 25 чал. на клм. Найгусьцей-жа заселена Валынскае ваяводзтва і напрыклад, Крэмянецкі пав. мае 73 чал. на клм.

На абшары 4-х усходніх ваяводзтваў маецца каля 600.000 гаспадарак.

Польская статыстыка падлічыла, што на абшары «Ўсходніх Крэсаў» маецца 4.281.600 гкт. квасных лугоў, пасьбішч і інш. няўжытковай зямлі—пераважна балот—і каля 1.000.000 гкт., лясных балот, а ўсяго звыш 5.000.000 гкт. якіх бяз мэліярацыі в карысьцю эксплёатаваць ня можна, але пасьля правядзеньня мэліярацыі гэтыя землі могуць быць скалёнізаваны. Праўда, ня даць нічога малазямельнай і беззямельнай мясцовай люднасьці таксама ня можна, але паны польскія калёнізатары лічаць, што і пасьля задаволеньня неабходных патрэб мясцовай люднасьці яшчэ застанецца якіх-небудзь 1.500.000 гкт. на якіх можна будзе ўдзекаваць каля 200.000 сем'яў (прыблізна 1 млн. людзей) з Польшчы.

Па думцы польскіх кіруючых сфэр калёнізацыя ня толькі падымае культуру «Ўсх. Крэсаў», ня толькі паменшыць перанаселенасьць цэнтральнай Польшчы, ня толькі зьменшыць польскую эміграцыю ў чужыя краі, але—што для іх самае галоўнае—калёнізацыя «Крэсаў»—павялічыць процант польскай люднасьці іх і ўзмоцніць адпорнасьць польскіх усходніх пагранічных райёнаў, заселеных пераважна няпольскай люднасьцю, быццам воража настроенай проці польскай дзяржаўнасьці.

Што гэты апошні матыў зьяўляецца самым галоўным у пытаньні аб калёнізацыі «Ўсходніх Крэсаў», ясна хоць-бы з таго, што яшчэ да прыступленьня да сыстэматычнай калёнізацыі, Польшча пачала раздаваць на «Ўсх. Крэсах» землі так званым асаднікам, г. ё. вайсковым калёністам. Раздача гэтая адбывалася ў прысьпешным парадку анархічна. Ня лічыліся з тым, ці маракуе хоць што-небудзь у сельскай гаспадарцы той, хто атрымлівае досыць вялікі і добры надзел зямлі, ці будзе ён гаспадарыць, ці мо' прадасьць першаму ўстрэчнаму атрыманы кусок зямлі. Землі раздавалі патрыятычна-заяўлічным элемэнтам, якія прымалі ўдзел у вайне Польшчы з СССР і з немцамі, думаючы пры гэтым, што гэтыя элемэнты акажуцца найбольш прыгодным матар'ялам для абароны «Крэсаў» ад варожага суседа і найбольш стойкім праваднікам палёнізацыі. Гэтым вайсковым асаднікам раздаваліся тыя абшарніцкія землі, гаспадары якіх не вярнуліся пасьля скончэньня сусьветнай вайны на свае гаспадаркі. Не вярнуліся пераважна абшарнікі непалякі, бо, галоўным чынам, яны ўцякалі ў 1915 годзе перад наступаўшымі немцамі. Іх землі і дасталіся ў здабычу не мясцоваму беззямельнаму і малазямельнаму насяленьню, а польскім вайсковым калёністам. У другую чаргу пад вайсковую калёнізацыю пайшлі землі царкоўныя, дзе іх было звыш 30 гк. пры царкве. Зямель польскіх абшарнікаў, хоць-бы яны і не вярнуліся к законнаму тэрміну, амальшто ня бралі. І вось, як аказваецца цяпер на аснове анкет, разасланых у мінулым годзе павятовым старастам «Усх. Крэсаў», усіх вайсковых асаднікаў на гэтых «Крэсах» налічваецца 8.500 сем'яў.

Апрача вайсковых, землі раздаваліся потым і звычайным гаспадарам. Згодна з польскай статыстыкай, на абшары 4 усходніх ваяводзтваў асела да 1927 г. уключна 7246 сем'яў, утвараючы столькі-ж гаспадарак на 92620 гектарах зямлі. Гэтыя калёністы па нацыянальнасьці дзяліцца на: 6335 палякаў, 493 украінцаў, 351 беларусаў, 8 чэхаў, 51 немцаў і 8 яўрэяў.

Такім чынам, да 1928 г. Польшча павялічыла польскі элемэнт на «Ўсходніх Крэсах» на 8.500 вайсковых асадніцкіх сем'яў і 6335 невайсковых, а ўсяго—на 14835 польскіх сем'яў. Вярнуў пад увагу, што сярэднюю сям'ю трэба лічыць у 4-5 чалавек, мы атрымаем 60-75 тысяч палякаў, якіх, дзякуючы калёнізацыйна-палёнізатарскай палітыцы польскага ўраду, ужо ўсялеліся на абшары Зах. Беларусі і Зах. Украіны.

Беларускаму ці украінскаму селяніну польскі ўрад зямлі не дае. Наадварот, у панскай Польшчы ўсё робіцца, каб беларускі ці украінскі селянін зямлі ніякім спосабам не здабыў.

Польскія ўрады (як сучасны, так і папярэднія) добра ведаюць, што лішніх зямель на «Ўсходніх Крэсах» няма, што, наадварот, там ёсьць перанаселенасьць, што тамашняе беларускае і украінскае сялянства само душыцца ад малазямельля і безьзямельля, бо ў валаданьні гэтага сялянства знаходзіцца замала зямлі. Польскі ўрад таксама ведае, што ў першую чаргу трэба было-б задаволіць патрэбы ў зямлі мясцовых сялян, узяўшы гэтыя землі ад абшарнікаў, або з казённых фондаў і тады толькі, калі-б што засталося, даваць іншым. Аднак, польскі ўрад робіць так: у Польшчы ад абшарнікаў зямлі не адбірае, а на „Крэсах" патроху абскубае заможнейшых абшарнікаў і землі раздае «сваім». Зразумела, што панскі ўрад рабіць інакш ня можа.

Аднак, такая палітыка ўсё роўна ня вырашыць справы перанаселенасьці ўсяе Польшчы. Вядома, што натуральны прырост Польшчы раўняецца 400000 чалавек у год. „Ўсходнія-жа Крэсы", як мы гэта бачылі вышэй, за 8 гадоў калёнізацыі прынялі да сябе толькі 60-75 тысяч калёнізатарскіх элемэнтаў, значыць 8-9 тысяч чалавек у год. Што гэта значыць у параўнаньні з 400 тыс. прыросту? Гэта толькі 2 процанты здаволенага прыросту. Нават каб прыпусьціць, што дзякуючы асушцы Палесься і іншым мерам Польшчы ўдалося перакінуць на «Ўсх. Крэсы» міліён людзей, дык і тады яна толькі на некаторы час заматала-б дзюрку, бо пры штогодным прыросьце насяленьня на 400 тыс. чалавек калёнізацыя „Крэсаў" выратуе Польшчу ад перанасселенасьці толькі на 2 з паловаю гады. А потым што?

А далей усё-роўна будзе тое, што і цяпер мы бачым: будзе ўзрастаць польская эміграцыя за межы Польшчы. Паазяўрапейская эміграцыя з Польшчы да гэтага часу была наступная: у 1920 г.—74121 ч., у 1921 г.—107449 ч., у 1922 г.—38716 ч., у 1923 г.—55401 ч., у 1924 г.—22511 ч., у 1925 г. 38449 ч., у 1926 г.—49893 ч. Усяго за гэты час (7 гадоў)—386540 ч., у сярэднім—55220 ч. у год. Апрача таго, некаторая частка насяленьня Польшчы эміграе ў Эўропу, пераважна ў Францыю, і такім чынам можна лічыць, што ў сярэднім кожны год выэмігроўвае з Польшчы ў чужыя краі да 60000 чалавек, тады як асядае на «Ўсходніх Крэсах» толькі 8-9 тысяч. чал., г. ё. у 7 разоў менш. І гэта ня гледзячы на тое, што асаднічтва на «Ўсх. Крэсах» штучна падтрымліваецца, а эміграцыя выклікае вялікія для эмігрантаў выдаткі. Апрача зямлі, асаднікі-калёністы атрымліваюць на «Ўсх. Крэсах» лес і ўсё патрэбнае для будоўлі, жывы і мёртвы інвэнтар для вядзеньня гаспадаркі, кредыты, ільготы па выплаце падаткаў і г. д.

Каб выэміграваць з Польшчы ў Амэрыку, дык за адзін білет трэба заплаціць: да Канады—157 даляраў, да Паўднёвай Амэрыкі 106-115 дал. Дзеці ніжэй 10 гадоў плацяць палову. Такім чынам, сям'я з 5 асоб, у тым ліку двое малых дзяцей, за пераезд да Канады павінна заплаціць 628 дал., а да Паўднёвай Амэрыкі—424-460 даляраў. Пераезд, як бачым, ня танны. Але, апр

Мінэральнымі ўгнаеньнямі будзем забясьпечаны.

Намечана правесьці вапнаваньне і фасфараваньне ўсяе падзолістае паласы СССР.

МАСКВА. Саюзны СНК, заслухаўшы даклад ВСНГ СССР аб захадах дзеля павялічэньня вырабу мінэральных угнаеньняў, вызначыў такі вытворчы плян выпрацоўкі мінэральных угнаеньняў на 1928-29 год. Павінна быць выпрацавана **фасфарытнае мукі 260 тысяч тон, супэрфасфату—80 тысяч тон і 8 тысяч тон касьцянное мукі.** Сярэдні кошт супэрфасфату па ўсіх заводах СССР у 1928-29 г. павінен быць арыентыровачна даведзен да 37 руб, за тону проці 42 р. 97 к. (за справаздачнае першае паўгодзьдзе 1927-28 г.).

ВСНГ СССР і Дзяржаўнай Плянавай Камісіі прапануецца распрацаваць пяцігадовы плян разгортваньня тукавае прамысловасьці. Мінімальна да канца пяцігодкі павінна быць выпрацавана фасфарытаў, якія таюць у вадзе, 2.600 тысяч тон, фасфарытнае мукі—1.200 тысяч тон і калійных соляў—1.100 тысяч тон. Адначасна ВСНГ СССР і Дзяржаўнай Плянавай Камісіі прапануецца распрацаваць і максымальны варыянт пэрспэктыўнага пляну.

Агульная сума капітальных укладаў у тукавую прамысловасьць вызначана на 1928-29 г. у 65 міліёнаў рублёў. ВСНГ СССР прапануецца ў самы кароткі тэрмін наладзіць на машынабудаўнічых заводах СССР выраб належнае апаратуры і машын для тукавых заводаў.

Далей СНК прызнаў патрэбным і неадкладным, дзеля хуткага ўзьняцьця ўраджайнасьці правесьці вапнаваньне і фасфараваньне, нечарназёмнае падзолістае паласы СССР і фасфараваньне прымежных з ёю паўночных частак пераходнае лесастэпнае паласы. **Вапнаваньне павінна** быць праведзена ўвосень 1929 г. **на плошчы ня менш 350-ці тысяч гэктараў**, у першую чаргу на тэрыторыі Маскоўскае, Калускае, Бранскае і Пермскае губэрняў. Па іншых губэрнях нечорназёмнае паласы вапнаваньне павінна быць праведзена з такім разрахункам, каб гэтая праца падрыхтавала сялян і агранамічны склад да правядзеньня вапнаваньня ў наступным годзе ў пашыраным абхвace.

ВСНГ СССР прапануецца наладзіць у 1928-29 г. на цэмэнтававапнавых заводах ВСНГ РСФСР размолня менш чымся 400 тысяч тон вапельніку, які атрымліваецца, як непатрэбны прадукт з цамэнтна-вапеннае вытворчасьці.

Для стварэньня адзінства і плянавасьці ў сыстэме дастаўкі сельскай гаспадарцы мінэральных угнаеньняў прызнана мэтазгодным згуртаваць увесь збыт мінэральных угнаеньняў ва ўсесаюзным хэмічным сындыкаце.

Т-вы прыяцеляў дзяржаўных пазык на вёсцы.

ІНІЦЫЯТАРЫ Т-ВАЎ—САМІ СЯЛЯНЕ.

МАСКВА. Наркамфіну СССР паведамілі з Чарапаўца, што пасьля тыражу 34-е сэрыі пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі па ініцыятыве сялян адбылася нарада дэлегатаў, якія прысутнічалі на тыражы. Нарада ўхваліла заснаваць дабрахвотнае таварыства прыяцеляў дзяржаўнае пазыкі. Ёсьць вестакі, што ў іншых пунктах таксама стыхійна ўзьнікюць такія-ж таварыствы. У аддзел дзяржаўных пазык Наркамфіну СССР пададзена некалькі праэктаў заснаваньня таварыства прыяцеляў дзяржаўных пазык. Аўтарамі праэктаў зьяўляюцца пераважна рабочыя.

Палітбюро ЦК КП(б)У вітае ЦК УсеКП(б).

ХАРКАЎ, 26-X. Палітбюро ЦК КП(б)У вітае адозву ЦК УсеКП(б) да маскоўскае арганізацыі і простую адкрытую пастаноўку перад партыяй пытаньня аб палітычных памылках і ваганьнях Маскоўскае арганізацыі. Палітбюро са здаволеньнем зазначае, што маскоўская арганізацыя і МК цэлым зрабілі даць належны адпор правараму ўхілу і прымірэнчым да яго настроям, дапамагалі выправіць памылкі асобных кіруючых працаўнікоў і згуртаваць арганізацыю навакол ЦК на аснове правільнае і пасьлядоўнае партыйнае лініі.

Палітбюро, надаючы выключна важнае прынцыповае палітычнае значэньне барацьбе з правым ухілам і замірэнствам, а ў сувязі з гэтым і памылкам маскоўскай арганізацыі, лічыць патрэбным паставіць гэтае пытаньне на пленуме ЦК КП(б)У.

Францускі імпэрыялізм на чале антысавецкага блёку.

Зусім нядаўна на старонках „Савецкай Беларусі» мы пісалі аб агрэсыўных плянах Францыі, Польшчы і Румыніі супроць СССР, плянах вельмі шырокіх, якія маюць на мэце ня толькі паслабленьне магутнасьці Савецкага Саюзу, але і адрыў ад нас шэрагу вобласьцяў. У той час аб гэтых агрэсыўных плянах нашых клясавых ворагаў мы даведаліся з паведамленьня бухарэсцкага карэспандэнта нямецкай буржуазнай газэты „Бэрлінэр Тагеблят", але, як і можна было спадзявацца, далейшыя падзеі ў асноўным цалкам пацьвердзілі гэтыя выкрываньні нямецкага журналіста.

Ужо факт зблiжэньня пунктаў погляду Англіі і Францыі па шэраг палітычных пытаньняў і англа-француская марская згода ясна гаварылі за тое, што нашы ворагі ня дрэмлюць, што ў цішні сваіх міністэрскіх кабінэтаў яны плятуць крывавыя інтрыгі супроць першай у сьвеце Рэспублікі Працоўных.

Зараз, пасьля падпісаньня англа-францускай згоды, францускі генэральны штаб адкрыта вядзе сваю працу на ўтварэньню франка-польска-румынскага блёку супроць Савецкага Саюзу. Францускі генэрал Лерон зноў паехаў у падарожжа па сталіцах усходня-эўрапейскіх дзяржаў, але зараз ужо з чыста канкрэтнымі практычнымі заданьнямі.

І вось як вынікі ўсіх гэтых перагавораў, згодна паведамленьняў бэрлінскіх газэт, яму ўдалося дабіцца згоды паміж Францыяй, Польшчай і Румыніяй аб адзіным, у выпадку вайны, камандаваньні і аб адзінай накіраванай супроць СССР стратэгіі. Польша абяцае Румыніі ў выпадку вайны з СССР уліць у румынскую армію тры польскія дывізіі, разьмяркоўваюцца ролі ў вярхоўным камандаваньні адзіным польска-румынскім фронтам, распрацоўваецца янэрацыйны плян вайны супроць СССР. Разгалоскі паміж Польшчаю і Румыніяй былі толькі ў пытаньні аб тым, якую весьці стратэгію—наступальную ці абарончую. **Польшча выказвалася за наступальную.** Румынія—за абарончую стратэгію. Але з дапамогай таго-ж генэрала Лерона згода ў гэтым пытаньні дасягнута **і плян апэрацыйны супроць Савецкага Саюзу закончан.**

Цяпер генэрал Лерон дамагаецца другога—аднастайнага ўзброеньня францускай, румынскай і польскай армій. З гэтага ўжо ня цяжка зрабіць вывад, што ўсе тры ўрады маркуюць весьці вайну супроць аднаго агульнага ворага. Таму Францыя і імкнецца ўвесьці адзінае ўзброеньне ва ўсіх трох арміях, бо тады будзе значна лягчэй дастаўляць ёй у часе вайны амуніцыю і баявыя прылады. Ці варта гаварыць, што гэтым ворагам можа быць ніхто іншы, як толькі СССР.

Францыя не абмяжоўваецца дастаўкай толькі ўзброеньне. Яна абяцае даць ня толькі сваіх афіцэраў генэральнага штабу, але і войска для вядзеньня вайны з Савецкім Саюзам.

Апроч усіх гэтых даных, узмоцненая падрыхтоўка да вайны Францыі выяўляецца ў тым, што, як паведамляюць францускія газэты, утварылася буйнае акцыянэрнае таварыства ў складзе вядомай францускай фірмы Шнэйдэр-Крэзо і вялізных заводаў Школа ў Чэха-Славакіі для дастаўкі зброі ўсходнім саюзьнікам Францыі.

Спроба пана Пілсудзкага дабіцца згоды паміж Румыніяй і Вэнгрыяй, каб гэтым уцягнуць і Вэнгрыю ў антысавецкі блёк, пакуль што не ўдалася. Але пішто не гаворыць за тое, што гэта так і будзе далей, бо фашысцкая Вэнгрыя Хорці зацікаўлена ў нізрынуцьці Савецкага Саюзу, каб занадта доўга ўпірацца. Няладзілася спачатку справа і з чэхаславакамі. Іх міністр па замежных справах, вядомы лёкай сусьветнага імпэрыялізму Бэнеш, праўда, спачатку не згаджаўся на ўступленьне Чэха-Славакіі ў антысавецкі блёк, спасылаючыся, галоўным чынам, на тое, што рабочыя масы яго краіны зычліва настроены да Савецкага Саюзу. Але потым, наведаўшы Парыж і Лёндан і заручыўшыся, як відаць, некаторымі абяцаньнямі, Бэнэш зьмяніў сваю пазіцыю і згадзіўся ў кожным разе на пастаўку амуніцыі заводамі Школа для румынскай арміі. Бясспрэчна, у будучым ён пойдзе і па іншыя ўступкі.

Вядуцца перагаворы і для арганізацыі ваеннага заводу ў Сяміградзьдзі. У апошні час заўважваецца шырокая дзейнасьць прадстаўнікоў генэральных штабаў Францыі, Румыніі і Польшчы. Румынскі генэрал Мадарэску—галоўны інспэктар румынскай арміі—прымае ўдзел у працы ваеннай канфэрэнцыі ў Варшаве, канфэрэнцыі, аб якой да гэтага часу нічога ня было вядома і на якой дасягаецца згода паміж прадстаўнікамі генэральных плянаў Польшчы і Румыніі аб агульна-апэрацыйным пляне супроць СССР. Агент францускага імпэрыялізму, вядомы генэрал Лерон, зноў прыехаў у Бухарэст, адкуль накіроўваецца далей па выбітай сьцежцы ў Варшаву. У Бухарэсьце-ж знаходзіцца зараз і некаторыя афіцэры польскага генэральнага штабу.

Такім чынам, падрыхтоўка да вайны з СССР вядзецца нашымі клясавымі ворагамі ўжо зусім адкрыта і галоўнае кіраўніцтва ў вядзеньні гэтай падрыхтоўкі пераходзіць зараз у рукі францускага імпэрыялізму. Зразумела, Англія не застанецца бязьдзейным гледачом усіх гэтых антысавецкіх манэўраў. Але роля яе ў гэтай авантуры пакуль што толькі закулісная, бо англійскі імпэрыялізм прызвычаен заўсёды чужымі рукамі жар заграбаць.

Але факт існаваньня англа-францускай згоды, палепшаньне адносін паміж Англіяй і Польшчай, згода Англіі і Францыі ў віленскім пытаньні як і шэраг іншых акалічнасьцяў гавораць за тое, што тут справа не абыходзіцца і без англійскіх інтрыг.

Сплятаецца крывавае павуціньне. Нашы заклятыя клясавыя ворагі дзейнічаюць да вайны в намі.

Н. Беліна-Падгаецкі.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Водпуск лесу сялянству.

(Лист з Бабруйску).

Разьмеркаваньне і водпуск лесу зьяўляюцца самымі балючымі пытаньнямі па нашай акрузе. Попыт на лес вялікі. Водпуск лесу не здавальняе попыт, а пагэтаму вынікае шмат розных скаргаў і непаразуменьняў.

Тэхніка самога водпуску лесу з кожным годам удасканальваецца, рацыяналізуецца. Так, напрыклад, сёлета на Бабруйшчыне ўстанаўляецца водпуск лесу па сьпісах райённай лясной камісіі, прычым важна тое, што сьпісы гэтыя будуць паказваць ясна вучастак, у якім таму ці іншаму селяніну адводзіцца лес. У гэтых сьпісах будуць таксама прастаўлены нумары адпускаемых дрэў.

Кожны селянін, якому будзе вызначан к водпуску лес, зможа праверыць якасьць адпушчаемага лесу і ў выпадку якіх небудзь непаразуменьняў абскардзіць няправільны водпуск.

Да водпуску насельніцтву ў наступаючым годзе вызначана па Бабруйшчыне будаўнічага лесу 90800 куб. мэтраў і лесу для апалу—159878 кубічных мэтраў. Усяго сырарастучага лесу мяркуецца адпусьціць насельніцтву на 475 тысяч рублёў, лічачы па таксе.

Побач з сырарастучым лесам будзе адпушчана яшчэ значная колькасьць і бурэлому, мёртвага і інш. лесу.

Пры водпуску лесу землеўпарадкаванае сялянства будзе карыстацца вялікімі ільготамі. Яму будзе дарэмна адпушчана лесу на 17526 руб. Бяднейшаму насельніцтву вёсак будзе ў наступным годзе адпушчана дарэмна лесу на 21776 рублёў, гэтым лесам будзе задаволена 109 тысяч гаспадарак. Бяднейшаму насельніцтву гораду таксама будзе адпушчацца бясплатна лес на суму 3700 руб. і пагарэльцам на 8300 руб.

Апрача зусім дарэмнага водпуску лесу будзе праводзіцца таксама водпуск лесу ў крэдыт. Крэдытны водпуск лесу разьлічан на 145 тысяч рублёў.

Для яшчэ большага ўдасканаленьня тэхнікі водпуску лесу ў адным з лясьніцтваў водпуск лесу будзе рабіцца ў гатовым відзе. Загатоўка яго будзе праводзіцца лесагам. Небясьпекі, што такое мерапрыёмства павялічыць значна адпускную цану лесу, няма. Гэтае павялічэньне будзе роўна 1 процанту, а карысьці яно прынясе шмат.

У сучасны момант апарат лясьніцтва рыхтуецца да водпуску лесу.

А. Дамброўскі.

Трэба ратаваць бядняцкі хлеб.

Магілеў, 27-X. З Кармянскага, Лупалаўскага і іншых райёнаў ідуць весткі, што натуральны памольны збор, які ідзе ў фонд загатовак для задавальненьня патрэб беднаты, **прыліпае да рук млынароў**, якія ня выпісваюць квіткоў на паступіўшыя «фунты».

Таксама ў шмат якіх мясцох зазначаюць на **дрэнную якасьць** здаваемага па памольнаму збору збожжа. Тлумачыцца гэта тым, што памольшчыкі часткам забіраюць нядобраякаснае зярно (прывозяць яго ў асобных мяшэчках, спэцыяльна для здачы за «фунты»), і млынары, прыкрываючыся нядобрасумленнасьцю памольшчыкаў, маюць, усваю чаргу, мажлівасьць фальсыфіцыраваць хлеб.

Трэба абавязаць спажывецкую кааперацыю прымаць ад млыноў толькі добраякаснае збожжа.

Забясьпечым своечасовы ўзнос страхоўкі.

Магілеў, 28-X. За мінулы гаспадарчы год па акрузе здарылася 1068 пажараў.

Недабрабытны быў год і з падзяжком жывёлы: пала 5067 кароў, асабліва вялікая колькасьць коняй—5254 галавы.

Град пашкодзіў 11461 гаспадарцы.

Агульная сума страт дзяржстраху—626.168 руб.

З 1 кастрычніка пачаліся зборы страхавых плацяжоў. У адзнаку ад папярэдняга году, **большая частка будынкаў застрахавана** не па акладных, а па **далявых нормах**, у разьмеры 40 процантаў іх сапраўднай каштоўнасьці. Гэта дало павялічэньне страхавых плацяжоў да сумы каля 900 тысяч рублёў (зразумела, і адказнасьць Дзяржстраху павялічылася).

Ільготы сярод беднаты разьмеркаваны.

Сёлета збор страхоўкі кладзецца выключна на сельсаветы і райвыканкомы, якія далкам і адказваюць за гэтую справу.

Выстаўка ў камуне.

(М. Росна, Аршаншчына).

Па ўсяму раёну сёлета «Дзень Ураджаю» прашоў з надта вялікім уздымам. Амаль у кожнай вёсцы адбыліся сходы сялян, на якіх аграномы выступалі з дакладамі.

Да правядзеньня сьвята былі прыцягнуты ўсе культурныя сілы раёну, як настаўнікі, загадчыкі хат-чытален, камсамольцы, партыйцы.

Сёлета сьвята «Дню Ураджаю» сапраўды ахапіла шырокія пласты сялянства, выявіла посьпехі і недахопы ў працы. У мястэчку была наладжана сельска-гаспадарчая выстаўка, на якой былі прадстаўлены экспанаты сялян культурнікаў і дасьледчыкаў. Прадстаўнік з акругі рабіў даклад аб вядзеньні сельскае гаспадаркі і аб далейшых пэрспэктывах па павялічэньню ўраджайнасьці.

Сельска-гаспадарчая камуна «Росквіт», стаячая на першым месцы ў акрузе, наладзіла выстаўку, якую наведвалі сяляне суседніх вёсак.

Сельская гаспадарка мацнее.

(Ветрынскі раён, Полаччына).

З кожным годам расьце і мацнее сельская гаспадарка нашага раёну. Агранамічныя нарады пачынаюць знаходзіць належнае месца сярод сялян.

У гэтым годзе рэарганізавана 3 арцелі, арганізаваны 2 новыя арцелі, 2 таварыствы па супольнай апрацоўцы зямлі, 8 машынных таварыстваў; афармляюцца 4 таварыствы, арганізавана насеннае таварыства і малочная арцель.

Праведзена на шматпольле 17 пасёлкаў, 25 вёсак, 2 калгасы, 2 хутары, агулам 470 двароў, якія маюць 3216 гэкт. зямлі.

Пераход на шматпольле вялікі—на 47 проц. больш за мінулагодні.

У гэтым годзе пасеяна ў раёне 620 пудоў канюшыны, 90 пудоў цімафейкі, 100 пудоў сэрадэлі, 108 пудоў лубіну, 32 пуды розных карняплодаў. Сялянам прадана 1200 пудоў гатункованага жыта, 3100 пудоў падчышанага жыта і 4090 пудоў яравога пасеньня.

Ачышчана насеньня 26374 пуды, на 200 проц. больш, чым у мінулым годзе. Пратручана ад галаўні 3800 пудоў насеньня. Закладзена ў сялян 62 паказальных і дасьледчых вучасткаў. Праведзена 7 сельска-гаспадарчых курсаў, на якіх было 219 сялян і сялянак.

За гэты год агранамамі прачытана 300 лекцый па сельска-гаспадарчых пытаньнях. Па лекцыях перабывала звыш 7000 сялян. Закладзен насяковы сад. Таксама заклад ена 6 паказальных садоў, дзе сяляне навучаюцца садоўніцтву.

С. Міхальцоў.

Тав. Чарвякоў—пачэсны рабочы.

КЛІМАВІЧЫ, 27-X. Рабочыя першага ў Беларусі Клімавіцкага заводу па вырабу сілікатнай цэглы абралі тав. Чарвякова пачэсным рабочым заводу.

Крахмальны завод—да сьвята Кастрычніка.

Талочын, 27-X. *У сучасны момант крахмальны завод у Талочыне ўжо закончаны.*

Урачысты пуск новага заводу адбудзецца ў час сьвяткаваньня 11-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Пабудова гэтага заводу каштавала 325.000 руб.

Завод будзе пераапрацоўваць 5.000 пуд. бульбы ў дзень.

Пабудова інтэрнатаў для рабочых.

Рэчыца, 27-X. Праўленьне сярніковага трэсту распачало пабудову 4 дамоў для памяшканьняў рабочых, пасланых на фабрыку «Днепр» у Рэчыцы.

Намячаецца, што фабрыка ў красавіку—маі месяцы пяройдзе на 7-га дзённы рабочы дзень.

З пераходам фабрыкі на 7-гадзінны рабочы дзень будзе зроблен дадатковы набор рабочай сілы ўда 600 чалавек. Набор рабочай сілы будзе праводзіцца паступова з такім разьлікам, каб у студзені месяцы 1929 г. было ўжо прынята звыш 300 чал.

Арганізацыя сельска-гасп. майстэрняў.

Гомель, 26-X. У акрузе намячаецца арганізаваць 11 майстэрняў па сярэдняму і бягучаму рамонту трактараў і складаных машын сельскага значэньня. 4 майстэрні намячаецца арганізаваць у савгасах, 6—у калгасах і 1 па лініі саматужна-прамысловай кааперацыі.

Для правядзеньня арганізацыйнай працы і для інструктаваньня працаўнікоў майстэрняў намячаецца мець у штаце акруговай калектыўна-гаспадарчай сэкцыі мэханіка-інструктара, на ўтрыманьне якога запатрабаваны сродкі з НК Земляробства.

Скарачаецца продаж піва і гарэлкі.

Бабруйск, 26-X. *З мэтай пашырэньня барацьбы з п'янствам, Бабруйскі гарсавет пастанавіў значна скараціць сець піўных у рабочых раёнах. Бабруйскі цэрабкоп таксама скараціў продаж гарэлкі з сваіх крам.*

Памяшканьні некаторых піўніц скарыстоўваюцца для культурных мэт.

Кааперараваньне беднаты ў арцелі

МАГІЛЕЎ, 24-X. За мінулы гаспадарчы год саматужна-прамысловы саюз разам з сваёю сеткаю вылучылі на кааперараваньне беднаты 5026 руб.; акрамя таго, на тую-ж мэту разьмеркавана 9000 р. доўгатэрміновага крэдыту.

Прамтавары ў вёску.

Віцебск, 27-X. За апошнія 7 дзён спажывецкая кааперацыя атрымала—200.000 мэтраў бавоўнянай папяровай тканіны, 50000 кілё імпартных селядцоў, 8000 кілё манная крупы, 8 вагонаў чыгуну і на 65000 р. розных скураных тавараў.

Усе гэтыя прамтавары накіроўваюцца па вёску.

Узмацніць хлебазагатоўкі.

За апошнія дэкады тэмп загатовак зьнізіўся.— Нізавыя загатоўцы сядзяць і чакаюць у мора надвор'я.— Нядобрае яшчэ наладжана зьбіраньне памольнага збору.

(Гутарка з намесьнікам Наркамгандлю БССР т. Абрамсонам).

Да 1-га кастрычніка па ўсёй БССР загатоўлена 10.077 тон розных хлебапрадуктаў і плян выкананы больш чым на 100 проц. За першую-ж дэкаду кастрычніка загатоўлена 2067 тон, што складае толькі 21,6 проц. месячнага пляну.

Па вестках за апошнія дэкады кастрычніка загатоўкі супроць апошніх 10 дзён верасьня зьмяншаюцца. Зьнижэньне ідзе як па лініі загатовак непасрэдна ад насельніцтва, так і ў галіне памольнага збору. Апрача аб'ектыўных прычын на зьніжэньне хлебазагатовак мае ўплыў і шэраг прычын суб'ектыўнага характару. Галоўная з гэтых прычын—недастатковая праца саміх дзяржаўных і кааперацыйных загатоўцаў і неваўсёды належная ўвага да пытаньня хлебазагатовак з боку мясцовых нізавых савецкіх арганізацый.

Нашы дзяржаўныя і кааперацыйныя загатоўцы недастаткова ўясьнілі сабе, што з выцясьненьнем прыватніка з загатавіцельнага рынку, яны зьяўляюцца не дабраахвотнымі загатоўцамі, а абавязаны весьці загатоўчую працу для снабжэньня гарадоў хлебам. Мы бачым, што наша нізавая кааперацыя яшчэ дагэтуль думае, што яе асноўная задача стаіць толькі ў разьмеркаваньні гатовых тавараў. Нам прыдзецца яшчэ шмат працаваць, каб нашай нізавой кааперацыі прывіць функцыі абавязковага загатоўцы.

Досыць прывесьці факт, калі ўся сыстэма спажывецкай кааперацыі Гомельшчыны нават і ня думае займацца загатоўкай бульбы. Аршанскі «Днепросаюз» ні за вошта не жадаў заключыць дагавор з ЦРК на загатоўку для апошняга бульбы. Трэба адзначыць яшчэ адзін момант, які мае ў загатоўках надзвычайнае значэньне. Мы маем выпадкі, калі нізавы загатоўчы апарат не ў базарныя дні сядзіць у сваіх крамах і чакае ў мора надвор'я,—чакае, пакуль селянін прывязе хлебапрадукты яму ў краму. Мала практыкуецца мэтадаў: быць на вёсцы, ведаць хто павінен прадаваць, азнаёміць сялянства з умовамі продажу хлеб і г. д. На мясцох ствараюцца такі абставіны: калі летась нам трэба быў крычаць на загатоўцаў, якія ў лік 3-2 прадстаўнікоў кідаліся на аднаго селяніна, дык сёлета наадварот—загатоўцы будуць сядзець і чакаць пакуль сялянства само не прывязе хлеб і пад нос.

Калі ў загатоўках хлеба непасрэдна ад насельніцтва ў слабым тэмпе некаторы процант можна яшчэ прыпісаць аб'ектыўным прычынам, дык у галіне памольнага збору ніякіх аб'ектыўных ужо няма. У гэтай справе цалкам наваты як мясцовыя кааперацыйныя арганізацыі, так і сельскія камітэты ўзаемадапамогі, якія недастаткова ўдзяляюць увагі пытаньню зьбіраньня памольнага збору.

Пры наяўнасьці закону, водлуг якога млынары ў абавязковым парадку павінны здаваць памольны збор кааперацыі, трэба на мясцох з'арганізаваць справу так, каб не даваць магчымасьці арандатарам млыноў захоўваць гэты збор і здаваць яго нам. Вопыт паказвае, як толькі вольныя цэны на хлеб павышаюцца, дык зараз-жа пачынаецца зьмяншацца паступленьне памольнага збору.

Апрача мер чыста арганізацыйных трэба яшчэ больш увагі гэтаму пытаньню ўдзяліць нашым органам юстыцыі. Трэба врабіць так, каб справы злосных млынароў разглядаліся ў тэрміновым парадку і больш сурова карацца за захоўваньне тых хлебапрадуктаў, якія, галоўным чынам, ідуць для зьнішчэньня сялянскай беднаты. Наш камітэты сялянскай узаемадапамогі павінны быць крэўна зацікаўлены ў тым, каб млынары не змаглі захаваць ні воднага фунта хлеба і дапамагаць нізавой спажывецкай кааперацыі наладзіць поўнае і своечасовае паступленьне апошняго памольнага збору.

У заключэньне трэба сказаць яшчэ раз, што нашым дзяржаўным і кааперацыйным арганізацыям неабходна прыняць усе меры, напружыць усе сілы, каб тэмп загатовак хлебных прадуктаў быў узмоцнен.

БЕЛАРУСКАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ СТАНОВІЦЦА НА МОЦНЫ ЭКАНАМІЧНЫ ГРУНТ

(Па матар'ялах ВСНГБ аб працы прамысловасьці ў верасьні і па пярэдніх выніках за 1927-28 г.).

Беларуская прамысловасьць, да верасьня гэтага году, мае шмат станоўчых вынікаў. Галоўныя з іх наступныя: Выпрацоўка, у параўнаньні з верасьнем леташняга году, дае ўзрост на 31 проц. Агульны кошт прадукцыі прамысловасьці БССР за верасень дасягнуў 9.779.000 рублёў.

Беларуская прамысловасьць у верасьні ня была стабільнаю і ў сэнсе рабочай сілы, бо за гэты месяц колькасьць рабсілы дасягнула 25.800 чалавек, узросшы на 3,9 проц. у параўнаньні са жніўнем г. г. А гэта мае вялікае значэньне для беспрацоўя ў БССР.

І ў справе прадукцыйнасьці працы наша прамысловасьць дала большменш здавальняючыя вынікі. Выпрацоўка аднаго рабочага ў дзень (па даваенных цэнах) таксама павялічылася на 1,2 проц.

Зарплата аднаго рабочага ў дзень у жніўні г. г. складала 2 р. 81 кап. Гэта, у параўнаньні са жніўнем леташняга году, дае павялічэньне на 16,1 проц.

Па папярэдніх падліках вынікі працы прамысловасьці за сёлетні год ступаюць:

Прадукцыя, па даваенных цэнах, дасягнула 47 міліёнаў рублёў, даўшы павялічэньне, у параўнаньні з леташнім годам, на 25,5 проц. Колькасьць рабочых узрасла на 9 проц.

Прадукцыйнасьць працы павялічылася на 16,3 проц. Зарплата за 1 месяцаў, у параўнаньні з адпаведным перыядам леташняга году, узрасла на 15 проц.

Такім чынам, мінулы (1927-28) гаспадарчы год, ня гледзячы на шмат цяжкасьцяй, з якімі прыходзілася сустракацца, усё-ж у асноўным, дасягнуў цэлы шэраг станоўчых вынікаў.

Шмат дасягнула прамысловасьць у сэнсе якасьці працы.

Пасьля 1926-27 гаспадарчага году, які даў **павялічэньне сабекошту прадукцыі**, у 1927-28 годзе чакаецца **зьніжэньне сабекашту прадукцыі на 4—4,5 проц.**

Аднак, ня гледзячы на гэта, перад прамысловасьцю і надалей стаіць генэральная задача—зьніжэньне сабекошту прадукцыі.

С. Азэрскі.

МІХАСЬ ЗАРЭЦКІ.

ПАДАРОЖЖА НА НОВУЮ ЗЯМЛЮ*).

ПРА МАГУТНЫХ ЖАЛЕЗНЫХ ЗЬВЯРОЎ.

Гэта быў апошні дзень нашага гасьцяваньня на Новай Зямлі. Надвор'е спрыяла нам: стаяла ціхая сонечнамяккая восень, якая грэла зямлю сваім пашчотным дыханьнем, якая грэла людзей цёплым напамінам аб яснотах мінулага лета, аб яснотах усяго мінулага, перажытага.

Апошняя паездка наша была ў в. Ніжын—мы ехалі паглядзець, як людзі забіраюць там у свае рукі свавольную гарэзьніцу Арасу, як робяць з яе новую—сьціплую і слухмяную рэчку.

Яшчэ здалёку пачулі мы злоснае гурчаньне, быццам залёг там, у берагох ракі, нейкі страшны крыважэрны зьвер, гатовы кінуцца на кожнага, хто пасьмеліцца да яго падыйсьці. Потым пачуліся наясныя галасы людзей, і ўжо здалося іншае, здалося, што людзі злавілі крыважэрнага зьвера і ён стогне, пераможаны, абясьсілены, хрыпіць у апошніх перадсьмяротных патугах.

Мы выехалі на бераг Арасы і адразу ўбачылі таго страшнога магутнага зьвера. Так, ён быў пераможаны. Людзі яго перамаг і і прымусілі служыць сабе, рабіць усё тое, што яны загадаюць.

Гэта была вялізная дзівосная машына. Корпус яе стаяў на шырокім пантоне—ён быў так прыладжан, што мог варочацца то ў адзін, то ў другі бок, і гэта сапраўды рабіла машыну падобнай да нейкага жывога стварэньня. Гэта ўражаньне ўзмацнілася яшчэ тым, што ад корпуса адыходзіў даўжэзны хобат, які таксама быў рухавы ён мог падыматца высока ўгару і спускацца ўніз, да самай вады. А на канцы хобату вісеў чорны бяздонны чарпак, ад краёў якога адыходзілі ўніз два рады сталёвых зубоў. Гэтыя зубы маглі сашчапляцца, і тады яны замыкалі ніжні прахон чарпака, а ў разгорнутым стане яны рабілі ўражаньне шырока разьзяўленай ляпы зубастага зьвера.

Мы з прагнай цікавасьцю дзівавалісь з работы гэтага магутнага жалезнага зьвера. Ён паволі, быццам адчуваючы сваю бязьмерную сілу, паварочваўся на сярэдзіну рэчкі, хобат яго апускаўся ўніз і чорны чарпак, разьзявіўшы зубастую ляпу, кідаўся ў ваду і з злосным гурчэньнем угрызаўся ў рачное дно, набіраючы поўны рот глею, пяску, падводных карчоў—усяго таго, што трапляе яму пад зубы. Потым хобат узьнімаўся ўгару, чарпак з шумам выныраў з-пад вады—зубы яго былі туга сашчэраны і спаміж іх цякла брудная густая сьліна. Потым зьвер паварочваўся назад і чарпак, апынуўшыся над берагам, шырока разьзяўляў сваю ляпу і выхарквў усё тое, што набраў там, на дне ракі.

Гэты зьвер завецца—землячарпалка. Ён прызначаны для чысткі рачнога дна, для паглыбленьня рэчкі і нават для пракопкі новага рэчышча. Ён дастае ў вадзе на тры мэтры глыбіні і мае такую сілу, што можа вырваць з зямлі самы вялізны, самы ўпарты корч.

Два такія зьвяры працуюць на Арасе. Іх вялісалі з Нямеччыны, і немцы самі прыяжджалі сюды, каб іх паставіць. Я ніяк ня мог даць веры, каб немцы — сумленныя, акуратныя немцы—маглі нас ашукаць, але мяне запэўнілі, што гэта так. Яны паставілі некалькі дрэнных слабых часьцей, і машыны часта псуюцца.

Адылі хто нас не ашукае!

Гэтыя машыны, выгрызаючы і паглыбляючы рачное дно, паступова пасуваюцца ўніз па Арасе. Яны праходзяць за дзень у сярэднім па дзесяць мэтраў. Па працягу 180 вёрст яны павінны выгрызьці ўсе перамелы, усе заносы, і на дзесяткі вёрст пракапаць новае рачышча, каб скараціць занадта вілаватую сьцежку гарэзьніцы—Арасы. Замест гэтых 180 вёрст новая—сьціплая, слухмяная—Араса будзе прабягаць толькі 120. На ўсім працягу сваім яна будзе даступная для лайб, для барлін і нават для плоскадонных параходаў. Апрача таго, ад аднаго толькі ўрэгуляваньня гэтае рэчкі асушацца тысячы гэктараў прырэчных балот, і значна палегчыцца асушка ўсяго басэйну.

Араса стане новай жыватворчай артэрыяй гэтага райёну.

Надзіваўшыся в работы дзівоснага зьвера-машыны, мы паплылі на лодках угару, каб паглядзець на сьляды гэтай работы. Там перад намі адкрылася ў поўнай сваёй велічы сіла машыны, сіла, якая можа пераварнуць усё, якая можа зьмяніць, перарабіць на новы лад увесь сьвет.

Нам давялося плысьці па новаму рэчышчу, праведзенаму скрозь глухі непраходны лес. Раней я дзівіўся сіле людзей, якія пракладалі праз нетры дзікага лесу роўную гладкую дарогу. Цяпер я ўдвая дзівіўся сіле машыны, якая праз гэткі самы лес правяла шырокую многаводную рэчку.

Пачынаюць з таго, што высякаюць дрэвы. Гэта і ўсё, чым трэба дапамагчы машыне. Яна сама ўжо павырывае з карэньнем тоўстыя векавыя пні, яна сама раскапае адвечную нечапаную глебу і зробіць прытульнае чыстае логава для красуні-рэчкі.

Роўны празрысты канал, які мае 20 мэтраў ушыркі і блізка 2,40 мэтра глыбіні—вось сьлады работы магутнага жалезнага зьвера-машыны.

Яшчэ паказалі нам на Арасе месца, дзе будуецца «плывучы пасёлак». На шырокіх барлінах будуць пабудаваны дамы, у якіх маюць жыць рабочыя, што абслугоўваюць землячарпалкі. Гэтыя плывучыя дамы разам з самымі машынамі складуць вялікі рухомы караван, які будзе лёгка перакідацца з аднаго месца ракі на другое, які, скончыўшы работу на Арасе, можа быць скарыстаны і на любой з іншых палескіх рэк.

МЫ ЕДЗЕМ НАЗАД, І Я КАНЧАЮ СВАЁ АПАВЯДАНЬНЕ.

Вось і ўсё...

Мы едзем назад. Шэрым восенскім раньнем мы пакінулі поўную цудаў і харастваа Новую Зямлю і падаліся далей у глыб Палесься, каб трапіць на адну з чыгуначных станцый лініі Жыткавічы—Гомель.

Даўгая, марудная, але і надзвычайна цікавая дарога.

Мы плылі ўніз па Арасе на лёгкіх, спрытных «пірогах», і яшчэ раз я слухаў шопат чарота, і яшчэ раз любаваўся экзотычным хараством гэтае цудоўнае рэчкі.

Мы недалужна курчыліся пад заліўным дажджом, трасучыся па брудных рабраватых палескіх грэблях і пасылаючы жудасныя праклёны ўсім і ўсяму, што толькі трапляе на памяць.

Мы чыстай месячнай ноччу пераяжджалі праз глухія лясы, і нас злавесным натоўпам абкружалі фантастычныя дзівы начнога Палесься.

Мы пераяжджалі праз цэлыя вадзяныя прасторы, і нашы коні звонка плёскалі на вадзе, намацваючы пад ёй рэшткі паламанае грэблі.

Мы заяжджалі ў сталіцу палескага царства, у надзвычайна прыгожы раскінуты па крутых высокіх горах Мазыр, мы любаваліся магутнай в ліччу Прыпяці—беларускае Амазонкі

І на працягу ўсёй гэтай марудн дарогі, мы ўспаміналі Новую Зямл успаміналі той дзіўны куточак П лесься, дзе людзі дасталі першую слав ную перамогу над балотнай стыхія дзе людзі сваімі ўласнымі

БЯРЭЦЕ ПРЫКЛАД — РАЎНЯЙЦЕСЯ ПА ЛЕПШЫХ

паступова і нясупынна пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі

праз ініцыятыву грамадзкіх арганізацый

ПРАМЫСЛОВАЯ КААПЭРАЦЫЯ НА ПРАВІЛЬНЫМ ШЛЯХУ.

Барысаўская прамысловая каапэрація за кароткі тэрмін дамаглася значных дасягненьняў. Лік каапэраваных саматужнікаў павялічыўся з 306 чал. на 1 кастрычніка да 500 на 1 лютага 1928 г., такім чынам лік пайшчыкаў павялічыўся на 63 проц., прычым трэба адзначыць, што павялічэньне ідзе за кошт бяднейшых саматужнікаў.

Галоўная дзейнасьць прамысловай кредытнага таварыства—гэта выдача грошы саматужнікам на прамысловыя патрэбы.

З лютага месяца г. г. таварыства пачало займацца дастаўкаю сваім пайшчыкам неабходных тавараў для выробчасьці. За гэты кароткі тэрмін таварыства распаўсюдзіла тавараў сярод сваіх пайшчыкаў-саматужнікаў на 3.892 руб.

Асабліва неабходна падкрасьліць буйны рост вытворчага каапэраваньня саматужнікаў у арцелі. У той час, калі ў мінулым годзе арцеляў амаль што і ня было, зараз ужо маецца 16 арцеляў, якія аб'яднаюць 150 чал., у большасьці беднаты. Такім чынам каапэравана вытворчай каапэрацыяй каля 90 проц. саматужнікаў беднякоў.

Станоўчым бокам зьяўляецца тое, што за кароткі пэрыяд гэтыя арцелі сабралі значныя ўласныя сродкі, за кошт збору паёў і зьбіраньня прыбыткаў. Усяго арцелі маюць 19.229 руб. уласных сродкаў.

Арцелі аб'яднаюць саматужнікаў наступных прафэсій: шаўцы, загатоўшчыкі, панчошніцы, белашвейкі, ганчарнікі, шорнікі, цукернікі, транспартнікі, хлебнікі.

Барысаў. Р.

ШКОЛА НА ДАПАМОГУ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ.

Пры Дукорскай сямігодцы, Сьмілаўскага раёну, Менскай акр. існуюць вэчэрнія клясы з жывёлаводчаскім ухілам.

Мэта гэтых спэцклясаў—падрыхтаваць больш-менш сталага жывёлавода, які-б умеў правільна, згодна запатрабаваньням навукі, разводзіць, гадаваць, агледаць жывёлу і скарыстоўваць прадукты жывёлагадоўлі, у прыватнасьці малако.

Тэаретычныя веды вучні набываюць у школе, а практычныя—у савгасе «Дукора». Уся праца праводзіцца пад кіраўніцтвам настаўніка спэцыяліста.

Школьны савет рашыў, што веды вучняў павінны стаць ня толькі іх асобным здабыткам, а што яны павінны расьсяваць сярод ваколічнага насельніцтва, што яны павінны стаць грамадзкім здабыткам. З гэтаю мэтаю школа пастанавіла ўзяць шэфства, ці вярней з'арганізаваць сталы сельска-гаспадарчы гурток у бліжэйшым пасёлку Маставая, дзе сіламі вучняў спэцклясы пад кіраўніцтвам настаўніка, сыстэматычна, у працягу ўсяго навучальнага году праводзіць гутаркі па жывёлагадоўлі і скарыстоўваньню прадукцыі ад жывёлагадоўлі.

Ужо складзен плян і праграма працы, якая складаецца з самі асноўных тэм самага папулярнага характару. Плян і праграма павінны быць выкананы ў працягу першай паловы навучальнага году. П. В.

КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ СЕЛЬСКАЕ ГАСПАДАРКІ

Крок за крокам к лепшаму.

Яшчэ гады чатыры таму назад сяляне нашае вёскі, ня толькі старыя, але і моладзь, верылі ў бога. У гэтай справе рэвалюцыя спачатку не адбілася. Але час браў сваё.

... І зараз на вёсцы з богам жывуць ня болей, як 3-4 старухі.

У вёсцы арганізаваўся піянэрскі атрад. Да дзесяцігодзьдзя Кастрычніка ў вёсцы налічвалася толькі два камсамольцы і адзін партыец, а зараз налічваецца 7 камсамольцаў і тры партыйцы. Таксама з'арганізаваўся сельскараўскі гурток, насьценгазэта і г. д. У выніку—значна скарацілася п'янства і хуліганства, якое так моцна давала сябе адчуваць да рэвалюцыі.

Да рэвалюцыі ў школу наведвалася ня больш 50 процантаў дзяцей школьнага ўзросту, а цяпер—усе 100 процантаў дзяцей школьнага ўзросту за вучобай. Амаль што ўсе канчаюць сямёхгодку і шмат едзе вучыцца далей. Для няпісьменных дарослых быў утворан лікпункт, дзе большасьць дарослых няпісьменных навучыліся грамаце.

Газэты да рэвалюцыі ў нас чыталі поп ды староста. А цяпер у нас на кожныя тры двары 2 газэты. Ёсьць і радыё.

Да рэвалюцыі ў нас на полі была трохпалёўка са сваёй дачушкай—сахой. Сярэдні ўраджай з дзесяціны быў 45-48 пудоў жыта. Уходу за сенажацьцю ня было ніякага, у сувязі з гэтым ужо ў «каляды» сустракалі свайго заўсягдашняга госьця—бяскормiцу. А што датычна травасеяньня, дык і паняцця аб гэтым ня мелі. А цяпер у нас заведзена шматпольле з засевам траў—канюшыны, вікі—аўсянай мешаніны і г. д.

Да рэвалюцыі карняплодаў у нас зусім ня сеялі, а зараз плошча пад карняплодамі нясупынна расьце.

Поле з 1927 г. усё чыста засяваецца ачышчаным гатунковым насеньнем. Сярэдні ўраджай жыта за апошнія 4 гады быў 63 пуды з дзесяціны, а бывала і 100 пудоў. Праўда, да рэвалюцыі жывёлы ў вёсцы было болей, але ўся яна была прасьцюк. І наогул, з-за няўмелага дагляду, жывёлаводзтва прыносіла толькі страты ў гаспадарцы. Цяпер у нас жывёла на 60 процантаў завадзкая. Ацэньваюцца хлявы, заводзяцца дацкія кармушкі.

Саха і драўляная барана—вось і ўсе нашы «машыны» да рэвалюцыі. Цяпер у нас у кожнага гаспадара жалезны плуг і жалезная барана. На трох гаспадароў прыходзіцца пружынная барана. На 5 гаспадароў—адна сячкарня. Шмат акучнікаў, малак і г. д. Хлеб нашы сяляне ўвесь чыста абмалочваюць на малатарнях, а да рэвалюцыі мучыліся з цапамі. Драбіны (калёсы) ва ўсіх гаспадароў цяпер на жалезным ходу, чаго да рэвалюцыі ня было.

Яшчэ цяпер успамінаюць нашы сяляне дарэвалюцыйнага гандляра- Хаіма Эткіна. Драў з сялян ён, як сам жадаў супроць гарадзкіх цэн. Хоць і крахцелі сяляне, але купілі ў яго, бо ня ў горад-жа было ісьці за кожнай дробязьзю. А цяпер ля боку—каапэратыў. Цэны ў ім, што і ў горадзе. Большасьць гаспадароў у вёсцы каапэравана (63 проц.) Усе нашы сяляне зьяўляюцца пайшчыкамі насенаводнага таварыства, а некалькі гаспадароў—і жывёлаводнага таварыства, а таксама ўдзельнічаюць і ў іншых арцелях і т-вах.

Сяляне дружна правялі самаабкладаньне, раскупілі пазыку ўзмацненьня сельскай гаспадаркі, а таксама набылі аблігацыі пазык індустрыялізацыі.

Зразумела, ня ўсё яшчэ ў нас вусім добра. Ёсьць і недахопы. Дрэнна яшчэ з вадой, з дарогамі. Але трэ спадзявацца, што і гэтыя недахопы з працягам часу паступова будуць зьнішчаны.

Наша сялянства з кожным годам багацее. Усё болей і болей пачынае яно цікавіцца нашым сацыялістычным будаўніцтвам.

Наша сялянства цяпер упэўнілася, што толькі пад кіраўніцтвам ленінскай камуністычнай партыі можна пабудаваць лепшае жыцьцё, і што толькі ў саюзе з рабочымі—моц нашага сялянства.

Селянін А. ФУРСА.

Вёска Цітоўка, Магілеўшчына.

Асушаем балоты.

За сэзон сёлетняга году Маляціцкае мэліарацыйнае таварыства прарыла магістральную сетку па ракох Чорная Натыш і Мартвіца, працягам каля 7 кілёмэтраў. Акрамя таго, прарыта да 10 кілёмэтраў асушыцельных канаў і такім чынам адвяавана пад успашку і закультывіроўку 60 гэктараў балота.

Дзякуючы зацікаўленасьці і сьвядомасьці насельніцтва і добрай працы тэхніка-мэліатара, плян працы па магістральнай сетцы выканан з перавышэньнем бадай-што ў 1 з паловай разы і цалкам звыш пляну прарыты асушыцельныя каравы. Магістральная сетка будавалася на 50 процантаў на сродкі дзяржавы і на 50 процантаў на сродкі саброў таварыств, рэшта работ—выключна сродкамі насельніцтва.

Па гэтых рэчках маецца забалочанай сенажаці каля 1500 гэктараў, і ёсьць падстава меркаваць, што ўся плошча будзе, пры дапамозе дзяржавы, асушана.

Нажаль, мэліарацыйнае таварыства не атрымала трактар. А яно яго так дамагалася.

Магілеўшчына. К.—К.

праз самадзейнасьць рабочых і сялян

САМААБКЛАДАНЬНЕ СКАРЫСТАЛІ РАЦЫЯНАЛЬНА.

(*Крупскі раён*).

Кампанія па збору і скарыстаньню сродкаў самаабкладаньня па Крупскаму раёну падыходзіць к канцу і ўжо ў сучасны момант можна даць вынікі гэтай кампаніі.

Бягучы навучальны год абагаціўся двума новымі дабудаванымі школьнымі будынкамі новага тыпу, на якія скарыстана--4000 рублёў. Адрамантавана 8 школьных памяшканьняў, на што скарыстана 1600 рублёў, абсталяваны 2 уноў адчыненыя школы на суму 590 рублёў. Скарыстана на дзіцячыя пляцоўкі — 720 руб. і прыступлена к скарыстаньню фонду дапамогі бядняцкім вучням, якога маецца 1325 руб.

Адрамантавана крупская амбулаторыя з апэрацыйным пакоем: дзе афарбаваны падлогі і масьлянымі фарбамі сьцены, на што скарыстана—905 рублёў, на рамонт Бобрскага ўрачэбнага вучастку скарыстана—600 рублёў і Ухвальскага—260 руб.

Таксама самаабкладаньне значна палепшыла пажарную справу, на што скарыстана—3201 руб. Куплена 4 пажарныя машыны, пабудаваны пажарныя пуні і набыт некаторы патрэбны інвэнтар.

На шляхавае будаўніцтва-асыгнавана —5986 рублёў і ў большасьці сельсаветаў грошы скарыстаны. Пабудаваны і адрамантаваны масты і грэблі.

Наогул вынікамі скарыстаньня сродкаў самаабкладаньня Крупскі раён можа пахваліцца, ды і ёсьць на што паглядзець і паказаць сялянству, куды і на што пашлі сабраныя імі сродкі. Сродкі самаабкладаньня распылены, не скарыстоўваліся, а каардынаваліся так, што мерапрыёмствы ў гэтым напрамку далі належны эфэкт. Праўда, адступленьні ад закону былі і сродкі перакідаліся з савету ў савет, але-ж гэта выклікалася неабходнай патрэбнасьцю і больш за ўсё на патрэбы агульнага карыстаньня.

Клімковіч.

ПРАВІЛЬНА СКАРЫСТАЛІ СРОДКІ.

Урэчкі сельсавет Слуцкага раёну поўнасьцю выканаў дырэктыву адносна правільнага скарыстоўваньня сродкаў па самаабкладаньню. Праводзячы самаабкладаньне, сельсавет склаў плян яго скарыстаньня, плянам была прадугледжана пабудова лазьні з пустацелай цэглы. З гэтай мэтай была з'арганізавана вытворчая арцель, яная прыступіла к вытвору пустацелай цэглы і бэтонных кялец.

Такім чынам, сельсавет своечасова прыступіў к пабудове лазьні. З пачатку гэтае мейсца, дзе будавалася лазьня, было як-бы вытоўтай—усялякі селянін абавязкова лічыў патрэбным паглядзець будынак. Ішлі розныя гутаркі, адны гаварылі, што ад гэтага нічога на выйдзе, другія казалі, што мо' пабудуюць, але-ж гэта будзе каштаваць шмат грошай, але калі пабудова была скончана і падлічаны выдаткі, то ўсе гутаркі адпалі, бо кошт лазьні амаль што не тальней чым калі-б гэты будынак будаваўся з лесаматэ'ялу.

Цяпер селяне ўбачылі выгоднасьць будынку, і маем выпадкі, калі само сялянства атрымоўвае крэдыт і будуе сабе хаты; гэткія выпадкі маюць мейсца ў тымжа сельсавеце ў вёсцы Паўстынь.

Выходзячы з гэтага, трэба адзначыць, што Урэчкі сельсавет правільна падыйшоў к самаабкладаньню сродкаў па самаабкладаньню, ён склаў вытворчую арцель і паказаў выгоднасьць пабудовы каменных будынкаў, чым зрабіў штуршок сярод сялян свайго сельсавету.

Прыклад скарыстаньня сродкаў па самаабкладаньню Урэчскага сельсавету павінен быць і для іншых раёнаў і сельсаветаў.

Сьвірыдаў.

Бабруйшчына.

Вылучаем жанчын на адказную працу.

(Клічаўскі раён).

Да гэтага часу ў нашым раёне ніводная жанчына не працавала на адказнай працы. Гэта ня значыць, што і ня было. Ня было толькі сыстэматычнай працы ў гэтым пытаньні з боку адпаведных арганізацый.

У сучасны момант вылучаны ў нашым раёне тры жанчыны, якія ўжо працуюць на адказных пасадах. Яны ўжо працуюць на пасадах: старшынёй раённага камітэту сялянскай узаемадапамогі, загадчыцай галоўнай крамы Клічаўскага спажывецкага таварыства і сакратарам Уладзімірскага сельсавету.

Т. Байчук Фрося беларуска сялянка, спачатку працавала старшынёй сельсавету, цяпер працуе старшынёй КСУ.

Тав. Бехфальд Хая работніца, працавала па найму 7 гадоў, цяпер загадчыца крамы.

Тав. Барэйка батрачыла ўвесь час у сваіх дзядзькоў, цяпер вылучана сакратаром сельсавету.

Усе гэтыя жанчыны ахоплены вялікім імкненьнем да выкананьня сваіх абавязкаў. Мясцовым арганізацыям трэба будзе дапамагаць у іх штодзённай працы і прыцягваць да азнаямленьня з працай новы жаночы актыў, галоўным чынам, делегатак.

Тыя дырэктывы, якія дадзены вышэйшымі партыйнымі і савецкімі арганізацыямі аб вылучэньні жанчын на кіраўнічыя і адказныя пасады, выкананы.

Аноцкі.

Працкалектывы растуць.

Працкалектывы Мазыршчыны ў апошні год, як мера барацьбы з беспрацоўем, маюць лепшыя ўмовы, чым у мінулым годзе. Палепшылася іх гаспадарчае становішча, значна наладзілася пастаўка сыравіны і матар'ялу.

На 1 верасьня г.г. ва ўсіх працкалектывах занята 193 чал., з якіх 73 жанчыны і 25 падлеткаў у той час, калі ў мінулым годзе мы мелі 188 ч., із падлеткаў павялічыўся з 15 да 25. Як відаць, колькасьць працоўных павялічылася.

За тры кварталы мінулага году ўсе рабочыя працкалектываў прапрацавалі 4334 чалавека-дзён, за гэты-ж пэрыяд бягучага году 29181 дзень. Агульная сума, выплачаная за першы пэрыяд, складала 40058 руб., а за апошні пэрыяд—58559 руб.

Павялічэньне заработнай платы тлумачыцца тым, што ў 1928 годзе было менш прагулаў, чымся ў 1927 годзе. Сярэдняя зарплата аднаго рабочага ў 1927 г. складала 1 р. 65 к., а ў бягучым годзе—2 р. 01 к., павялічана на 22,4 проц. Па працкалектыву «Дамшэй» у мінулым годзе сярэдняя зарплата аднаго рабочага складала 47 р. 16 к., а ў бягучым годзе 80 р. 80 к. і г. д.

Выпрацоўка прадукцыі мае таксама тэндэнцыю ўзрост: у мінулым годзе было выпрацавана прадукцыі за 3 кварталы на 152779 руб., а сёлета за гэткія-ж 3 кварталы на 218134 руб. Якасьць вырабаў значна палепшылася.

Выторчасьць працы значна павысілася. Калі ў 1925-26 г. за адзін чалавекадзень было выпрацавана прадукцыі на 5 р. 89 к., а ў 1926-27 г. на 6 р. 82 к., дык у 1927-28 на 7 р. 05 к. Сабекошт прадукцыі зьніжаецца ў сярэднім на 5-10 проц. Калі мужчынскія боты ў 1926-27 г. каштавалі 8 р. 84 к., дык у 1927-28 г. яны каштуюць 17 р. 06 к. і г. д.

Асноўнай задачай, якая пастаўлена ў сучасны момант перад кіраўніцтвам працкалектываў, зьяўляецца тое, каб у бліжэйшы час, у мэтах прыцягненьня новых беспрацоўных, папырыць існуючыя працкалектывы, а таксама арганізаваць новыя працкалектывы дзеля скарыстаньня некваліфікаваных беспрацоўных.

Папырэньне мяркуецца правесьці на 82 чал., а ў новыя працкалектывы мяркуецца набраць 60 чалавек. Калі мясцовыя адпаведныя органы пойдуць насустрэч, у сэнсе прадстаўленьня памяшканьня, магчыма будзе ўцягнуць новых звыш 140 беспрацоўных.

Траба спадзявацца, што нашы партыйныя, прафэсыяльныя і савецкія органы будуць дапамагаць у справе папырэньня сеткі працкалектываў.

Яўхім.

Расьцём і разьвіваемся.

Тарасава, ранейшы маёнтак абшарніка Арамовіча, а ў сучасны момант савгас імя Карла Лібкнэхта,—аб'яднае сабою два маёнткі.

Бедную спадчыну пакінулі пасьля сябе ранейшыя абшарнікі. Увесь жывы інвэнтар зараз аб'яднаных маёнткаў складаўся з аднаго сьлепога каня, а з мёртвага інвэнтару засталося толькі некалькі земляробчых прыладаў старога тыпу; транспарт зусім адсутнічаў. Будынкі ў большасьці былі разваленыя. І няма нічога дзіўнага, што да 1927 г. савгас даваў толькі адны страты.

Цяпер, дзякуючы рацыянальнаму вядзеньню гаспадаркі, малюнак зусім зьмяніўся: савгас Тарасава цяпер у самым росквіце. У 1927 г. ён даў 4128 руб. чыстага прыбытку. Жывога інвэнтару савгас мае 62 каровы і два гатунковыя бугаі. Большасьць рагатае жывёлы гатунку «сэментал»; ёсьць каровы-галяндкі. Рабочых коняй у савгасе 33. Большасьць коняй ардынскага гатунку. Савгас мае трактар, земляробчыя прылады і машыны навейшае канструкцыі. Сёлета савгас набыў гонтарэзны варштат для сваіх гаспадарчых патрэб. Рамонт машын і земляробчых прыладаў робіцца тут-жа ў кузьні, якая належыць савгасу.

За гэтыя восем гадоў савгас значна здбудаваўся і адрамантаваўся. Пабудавана новае гумно, новы сенавал, гараж для трактара, новая лазьня і бэтонная студня. Праведзен капітальны рамонт гумна, пуні, ледніка, дзьвюх дач і, апрача таго, адрэмантаваны вялікі дом. Закладзена 47 ран цяпліц для гародніны, якая рэалізуецца ў Ратамскі каапэратыў і дом адпачынку пры станцыі Здановічы.

Савгас набыў 14 семʼяў пчол, якія зьмяшчаюцца ў вуляях сыстэмы «Дадан». У савгасе пад пасевамі 376,17 дзесяцін зямлі; сенажацьцю занята 57,64 дзесяціна зямлі, культурны сад займае 7 дзесяцін і гарод 6,5 дзесяціны.

Апрацоўка зямлі праводзіцца пры дапамозе трактара і коняй у дзьве зьмены. Засяваюцца палі выключна селекцыйным насеньнем. Сёлета ўраджай жыта сярэдні, але азіміна на 10 процантаў, а яравіна на 30 проц. лепшая, чымся летась. Апрача пасеваў, вялікі прыбытак дае малочная гаспадарка; малако дастаўляецца ў дом адпачынку пры ст. Здановічы і ў Менскую малочную.

Увесь ураджай сёлета будзе рэалізаваны выключна толькі па нарадах Белсельсаюзу.

Савгас Тарасава аказвае значную дапамогу ваколічным сялянам, дастаўляе ім сэлекцыйнае насеньне для пасеваў і дарэмна робіць сартыроўку зярна. Пры савгасе маецца злучны пункт. Сёлета прадугледжваецца зрабіць абмен з ваколічнымі сялянамі каля 3000 пудоў зярна з новага ўраджаю.

У савгасе ёсьць клюб, дзе час ад часу ставяцца спэктаклі, драмгурток савгасу выяжджае і ў ваколічныя пасёлкі ставіць спэктаклі.

Ня гледзячы на мізэрныя сродкі, якія выдаюцца на культпатрэбы, бібліятэка савгасу нэрэгулярна папаўняецца новымі кнігамі; апрача таго, савгас выпісвае 62 газэты і 6 часопісаў. Пры клюбе маецца радыё і гучнагаварыцель. Апрача таго, ёсьць хата-чытальня і бібліятэка. Агульныя сходы праводзяцца рэгулярна—штомесяц. На агульных сходах прысутнічаюць ваколічныя сяляне і бяруць удзел у спрэчках.

Адну акалічнасьць у працы савгасу можна палічыць адмоўнай—гэта тое, што тут не вядзецца ніякае шэфскае працы.

Наогул, праца ў савгасе Тарасава праходзіць нармальна.

Меншчына. Б.

Палепшылі дабрабыт вёскі.

Агульная сума сабраных грошай ад самаабкладаньня па Цідэранскаму сельсавету 3120 р. Уся сума грошай была разьмеркавана на наступнае: на пажарнае будаўніцтва 600 рублёў; шляхавае — 600 рублёў; школьнае—1500 р.; мэдыцынскую дапамогу —100 р.; у фонд дапамогі вучням-беднякам—220 р. і іншае (патрэбы для школ, яслі, пляцоўка і іншае)—450 р. 16 к.

Сродкі, якія разьмяркоўваліся, амаль усе скарыстаны на тую галіну, на якую яны вызначаліся.

Па пажарнаму будаўніцтву затрачана 447 р. 86 к.; куплена машына, усталёўлены чаны для вады, пачынена пажарная пуня і інвэнтар.

На шляхавае будаўніцтва скарыстана 500 р. пабудаваны масты, пачынены дарогі, як відаць па пляну большасьць дарог пачынена ў мястэчку і бліжэйшых вёсках.

Фонд дапамогі бядняцкім вучням скарыстаны мала, усяго на 50 р. 80 кап. Вучням дапаможана матар'яльна, астатнія сродкі пущчаны на школьнае будаўніцтва. Мэдыцынскі фонд скарыстаны ўвесь.

Званец.

м. Цяцерын, Аршанскай акругі.

Зразумелі і падзякавалі.

(Першы прыгарадны сельсавет, Меншчына).

У працягу некалькіх апошніх гадоў насельніцтва Кальварыі па чале са школаю прымушана было хадзіць па ваду на суседні хутар, які знаходзіцца за вярсту ад іх, і плаціць за яе 50 к. —1 р. у месяц з кожнага гаспадара. Вядома ўжо, як цанілася тут вада, прынесеная за вярсту: ніць давалася кожнаму, хто хацеў і прасіў вады, а толькі дарагому госьцю: а аб чыстаце і гаварыць ня прыходзіцца. Адным чынам, людзі зжыліся з гразёю, а скаціна труцілася чорнаю смугаю з бруднай ямы (сажалкі).

Насельніцтва бядавала, скардзілася на свой лёс, а як паправіць справу, ня ведала. Часта на бацькаўскіх сходах у школе абгаварвалася гэта пытаньне, але канкрэтнага вырашэньня не знаходзілася. Урэшце дагаварыліся перадаць справу на вырашэньне сельсавету. Праўда, сельсавет адразу-жа высунуў прапанову аб правядзеньні самаабкладаньня дзеля пабудовы пры школе калодзежа.

Ня гледзячы на тое, што частка бацькоў вучняў была ўжо падрыхтавана і прыхільна адносілася да самаабкладаньня, падтрымліваючы яго, патрабаваліся тры агульныя сходы сялян, пакуль сельсавету ўдалося правесьці пастанову аб самаабкладаньні ў 15 проц. ад с.-г. падатку. Заможнікі, якіх у гэтым раёне большасьць, былі вельмі нездаволены гэтай пастановай і доўга бурчэлі на сельсавет.

Цяпер-жа, калі за гэтыя сродкі закончылі пабудову калодзежа, і ваколічнае сялянства атрымала добрую ваду ў сябе дома, пачаліся сярод сялянства другія гутаркі.

— Ото ж дзякуй ім (прадстаўнікам сельсавету), што яны памаглі пабудаваць калодзеж. Мы самі тут век-бы мучыліся без вады, а ніколі-б не дадумаліся скласьці грошы на калодзеж.

Другія сьмяюцца з сябе, кажучы:

— Якія-ж мы былі дурныя: доўга спрачаліся з сельсаветам за 3-4 рублі на калодзеж, а самі дабрахвотна выкідалі па 6-10 руб. у год на ваду ды яшчэ хадзілі за вярсту за ёю, а цяпер-жа ваду маем дома!

Суседняя вёска Падыгрушава, якая таксама сядзіць без вады, наслухаўшыся такіх гутарак пра калодзеж, сама хоча ўзьняць пытаньне аб правядзеньні ў іх самаабкладаньня на пабудаву калодзежа.

Так паступова думка аб калектывізацыі прасякае ў самыя глухія куткі вёскі і палепшае яе дабрабыт.

Р—і.

— МЫ ЎСХОДЗІМ НА САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ РЭЙКІ.

ЕСЬЦЬ ЧАМУ ПАЗАЙЗДРОСЬЦІЦЬ.

Першы раз пачуў я аб вёсцы Нікольск за дваццаць вёрст ад яе—у пасёлку Будзіна на сходзе сялян.

— Культурная вёска,—ёсьць чаму пазайздросьціць, — апавядаў селянін, толькі што прыехаўшы адтуль. Яны падзялілі ўраджай, засяваюць канюшыну, караньплоды, арганізавалі жывёлагадоўчае таварыства, асушылі балоты.

Раённы аграном, тав. Асмалоўскі, таксама апавядаў аб дасягненьнях у вядзеньні сельскай гаспадаркі сялянамі гэтай вёскі.

У мяне зьявілася жаданьне паглядзець сваімі вачыма на дасягненьні гэтай вёскі, пагутарыць з сялянамі, распытаць аб жыцьці. І ў адну з нядзель я накіраваўся ў гэтую вёску.

Сябра сельсавету накіраваў нас да вядомага селяніна-дасьледчыка, таварыша Жачкіна.

Зьдзіўлены нашым прыездам, т. Жачкін—селянін гадоў каля сарака—жывы, практычны гаспадар, пачаў нам апавядаць аб сваёй вёсцы.

АЛЬБО ЗЯМЛЮ, АЛЬБО ЗЯМЛЯ.

—Наша вёска не настолькі культурна, як аб ёй апавядаюць. Праўда, параўнаўча яна культурна, яна вышэй за вакольныя вёскі, яна, як быццам, на высокай гары.

Але ўсётакі і ў нас пападаюцца такія дзівакі, якіх ніяк нельга пераканаць, што канюшыну карысна сеяць, што на балоце-багавіньці можна зрабіць квітнеючую сенажаць, што можна дасягнуць паўтары сотні пудоў ураджаю з дзесяціны.

Праўда, дзівакоў такіх у нашай вёсцы па пальцах пералічыш, а вось у суседніх—сьмех і... гора. Некалькі разоў прыходзілася гутарыць з імі аб падзяльцы ўраджайнасьці, прыходзілася даводзіць лічбамі, фактамі, прыкладамі карысьць культурнага гаспадараньня, дык яны, пазвяваючы пытаньні, адказваюць:

— Папявай—расьпявай... Ведаем, адкуль салавей. Угнаіў паласу, дык і ўраджай сабраў вялікі.

— А чаму вы ня ўгноіце?

— У нас няма лішняй коровы, як у цябе.

— Чаму-б вам не засеяць канюшыны і трымаць лішнюю карову?

— Канюшыну сеяць... Ха-ха-ха! Пад жыта зямлі не хапае. Ячменю няма дзе засеяць.

Прыходзіцца, урэшце, ім сказаць, што «стаўка на ячмень біта» у ўмовах Беларусі, і таго, хто трымае курс на ячмень—зямля «ў тры пагібелі» цісьне.

— Ячмень... хто яго ня сее? А навошта ён нам? Самая нявыгадная расьліна! — з упэўненасьцю і практычным веданьнем справы кажа Жачкін.—Альбо зямля возьме цябе кінцюрамі трохпольля, альбо ты зямлю —шматпольлем, канюшынай, культурнай апрацоўкай глебы...

ДАГОНІМ ДАНІЮ!

Модныя кінцюры імпэрыялістычнай вайны вырвалі дзесяткі здольных рабочых рук з вёскі і жорсткай жменяй рассеялі па гарадох, вёсках, хутарох—«культурнага, шчасьлівага» Захаду.

Людзі былі галоднымі ў сытай Нямеччыне, хадзілі абарванымі ў мануфактурнай Францыі. Людзі бачылі культурную пастаноўку гаспадараньня ў замежных краінах, сваімі мазолістымі рукамі нераз рассявалі штучнае ўгнаеньне на панскай зямлі і, вывучыўшы ўсё, упэўніліся, што гэта-ж самае можна зрабіць у нас, у нашай «лапцюжнай Беларусі».

Вось гэтыя адзінкі, прышоўшы дамоў з палону, калі скончылася сматоха грамадзянскай вайны, узяліся за адпаўленьне гаспадаркі.

Першым чынам—земляўпарадкаваліся. Вёска Нікольск была разьбіта на чатыры пасёлкі. Тры пасёлкі цалкам, у колькасьці 93 двароў, увялі травасеяньне. За чатыры гады,—1925-26-27 і 28 канюшына моваю сухіх лічбаў пацьвердзіла сваю карысьць. З 300 пудоў з дзесяціны ў 1925 годзе—дайшлі да 500 пудоў у гэтым годзе.

Галоўнае ў гэтым. Адсюль, як ад асноўнага моцнага рычагу, пайшло ўсё палепшаньне. Канюшына ліквідавала бяскормiцу, пазбавіла сялян ад раскрыцьця вясною саламяных прэлых стрэх; канюшына дала магчымасьць трымаць лішнюю карову, а адсюль, само сабой зразумела, угнаеньне павялічылася, ды і к таму, сама канюшына палепшыла якасьць глебы.

— Дагонім Данію!—Дагонім Нямеччыну! Над такімі лёзунгамі распачалі палепшаньне гаспадаркі былыя «пане рускіх».

„БУЛЬБА-КОРАНЬПЛОДЫ".

Гэта не навуковы тэрмін і не чарговае зьдзеканьне над мовай, а тым больш—не які-небудзь выкрутас,—гэта звычайнае, укаранёнае ў нікольцаў «в плоть и кровь» слова—«бульба-караньплоды».

Тут разумеюць гэта, як нешта суцэльнае, зьвязанае паміж сабой. Бульба і караньплоды—сястра і брат.

На гэтыя дзьве культуры сяляне зьвярнулі сур'ёзную ўвагу. Простым, механічным палепшаньнем самой пасадкі бульбы—замест падрад у тры праезды пасеялі ў адзін—павялічылі ўраджай з 400-500 пудоў з дзесяціны да 1000-1200 пудоў. З аднаго боку—эканомія пасяўнога матар'ялу, а з другога—павялічэньне ўраджаю.

Караньплодаў нікольцы атрымліваюць з дзесяціны да 3000 пудоў. Плошча пад караньплодамі з кожным годам павялічваецца за лік зьмяншэньня засеву нявыгадных культур, як напрыклад, нацыянальнага беларускага ячменю.

Сёлета два пасёлкі перайшлі на вась мінольны севазварот.

СУПРОЦЬ „ЧЫРВОНАЕ ТАСКАНКІ".

Славутая, беларуская «чырвоная тасканка»! Кожны ведае, што гэта карова дае малака па вядру, толькі ня ўдзень, а ў тыдзень.

Нікольцы задумаліся над палепшаньнем «жывёлагадоўчага міру». Засявасем канюшыну, увялі шматпольле, ёсьць многа бульбы, караньплоды, жывёлагадоўчае і мэліарацыйнае таварыства, «гул машыны»... Хіба ня цешыцца гэтым? Гэта стужка дробных, на першы погляд няпрыкметных, дасягненьняў, паказвае, што вёска пераараджаецца, хоць паступова, павольна, але сьмела і цьвёрда ўсходзіць на сацыялістычныя рэйкі.

ГУЛ МАШЫНЫ.

— Скуль у вас такі машыны гул?—здзіўлены, пыталіся мы ў стаўшай трупы сялян на вуліцы.

— Скуль?—паўтарылі яны:—хіба ня ведаеце, што нашы сяляне зрабіліся «народам машын?»

— Хіба вы ня ведаеце, што наша вёска мае 25 веялак і 18 малатарняў. Многія здабылі ў растэрміноўку ў крэдытным таварыстве, ёсьць малатарні набытыя калектыўна.

Далей мы даведаліся, што саха ў вёсцы даўно заменена плугам; апроч гэтага ў вёсцы маецца 5 пружынных барон, каля дзесятка акучнікаў, 3 сячкарні.

— Мы, нават, і балота асушвалі пры дапамозе трактару. Дзякуем Аршанскаму АКРЗА, які прыслаў нам яго на працу ў балоце.

— Дзіву даліся мы—як гэта—без канякі, без аўсо можна араць? Аказалася—зусім проста.

— Здабыўшы такую машыну, можна і ў калектыў аб'яднацца, хоць і застранеш дзе, дык вывезе.

І ЎРЭШЦЕ...

І ўрэшце—мы павінны прызнаць, што вёска Нікольск зьмяніла свой твар.

У чытача склалася-б няправільнае ўражаньне аб жыцьці сялян вёскі Нікольск, калі-б ён падумаў, што «на Кончатке спокойно»... Не! Ёсьць шмат пэрага, цёмнага, некультурнага ў гэтай вёсцы, людзі яшчэ бедны, занадта бедны!

Але нас цешыць тое, што рассыпаныя кроплі новага ўкараніліся моцна ў быце сялян. Канюшына, шматпольле, бульба, караньплоды, жывёлагадоўчае і мэліарацыйнае таварыствы, «гул машыны»... Хіба ня цешыцца гэтым? Гэта стужка дробных, на першы погляд, няпрыкметных, дасягненьняў, паказвае, што вёска пераараджаецца, хоць паступова, павольна, але сьмела і цьвёрда ўсходзіць на сацыялістычныя рэйкі.

Цім. Зарэчны.

З СЁНЬНЕШНІМ НУМАРОМ ГАЗЭТЫ РАССЫЛАЕЦЦА ДАДАТАК —«ПРАЦАЎНІК АСЬВЕТЫ» № 12.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

АБ ПАШЫРЭНЬНІ ПРАЎ РАЙЕННЫХ РЭВІЗІЙНЫХ КАМІСІЙ І РЭВІЗІЙНЫХ КАМІСІЙ ПРЫ СЕЛЬСКІХ І МЕСТАЧКОВЫХ САВЕТАХ.

У мэтах ажыўлення дзейнасьці рэвізійных камісій і ўзмацнення грамадзкага кантролю над асноўнымі галінамі работы нізавых саветаў і райённых выканаўчых камітэтаў Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту пастанаўляе:

1. Надаць права районным рэвізійным камісіям правяраць выкананьне раённымі выканаўчымі камітэтамі пастаноў райённага зьезду саветаў і рэвізійным камісіям пры сельскіх і местачковых саветах — права праверяць выкананьне саветамі наказаў выбаршчыкаў.

2. Абавязаць рэвізійныя камісіі на справаздачных сходах і раённых зьездах саветаў даваць адпаведныя справаздачы аб выніках сваіх рэвізійных абсьледаваньняў.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвяконў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

27 кастрычніка 1928 г.
г. Менск.

Постановление

Президиума Центрального ИсполнительногоКомитета БССР

О РАСШИРЕНИИ ПРАВ РАЙОННЫХ РЕВИЗИОННЫХ КОМИССИЙ И РЕВИЗИОННЫХ КОМИССИЙ ПРИ СЕЛЬСКИХ И МЕСТЕЧКОВЫХ СОВЕТАХ.

В целях оживления деятельности ревизионных комиссий и укрепления общественного контроля над основными отраслями работы низовых советов и районных исполнительных комитетов Президиум Центрального Исполнительного Комитета постановляет:

1. Предоставить право районным ревизионным комиссиям проверять исполнение районными исполнительными комитетами постановлений районного с'езда советов и ревизионным комиссиям при сельских и местечковых советах — права проверять исполнение советами наказов избирателей.

2. Обязать ревизионные комиссии на отчетных собраниях и районных с'ездах советов делать соответствующие отчеты о результатах своих ревизионных обследований.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

27 октября 1928 г.
г. Минск.

Пастанова

Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР

ПРА ЗБОР І РЭАЛІЗАЦЫЮ ЛОМУ ЧОРНЫХ МЭТАЛЯЎ.

На падставе пастановы Савету Працы і Абароны за 6-га кастрычніка 1928 г. (пр. 393 п. 10) Эканамічная Нарада пры Савеце Народных Камісараў БССР, у дадатак да сваёй пастановы за 10 студзеня 1928 г. (З. З. БССР 1928 г. № 8 арт. 62) пастанаўляе:

1. Абавязаць усе ўстановы і прадпрыёмствы, якія да гэтага часу яшчэ ня здалі прыналежнага ім лому чорных металяў, безадкладна рэалізаваць яго праз акцыйнае таварыства «Рудметалторг»; і на будучы час па меры накаплення лому рэалізаваць яго тым-жа парадкам.

2. Даручыць НК Гандлю БССР тэрмінова арганізаваць на тэрыторыі рэспублікі закупку лому чорных металяў у каапэрацыйных і грамадзкіх арганізацыяй і прыватных асоб па цэнах, якія ўстанаўляюцца НК Гандлю СССР.

Закупка павінна праводзіцца сельскагаспадарчай і спажывецкай каапэрацыяй і дзяржаўнымі гандлёвымі арганізацыямі, якія займаюцца зборам утылізацыйнай сыравіны.

3. Парадак рэалізацыі лому ўстанаўляецца Народным Камісарыятам Гандлю па ўзгадненьню з Вышэйшым Саветам Народнае Гаспадаркі ў адпаведнасьці з пастановай Савету Працы і Абароны за 6-X 28 г. (пр. № 393).

Старшыня Эканамічнае Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР М. Карклін.

Нам. Кіраўніка Спраў СНК і Эканамічнае Нарады БССР В. Крывіцкі.

25 кастрычніка 28 г.
г. Менск.

Постановление

Экономического Совещания при Совете Народных Комиссаров БССР

О СБОРЕ И РЕАЛИЗАЦИИ ЛОМА ЧОРНЫХ МЕТАЛЛОВ.

На основании постановления Совета Труда и Обороны от 6-го октября 1928 г. (пр. № 393 п. 10) Экономическое Совещание при Совете Народных Комиссаров БССР, в дополнение к постановлению своему 10 января 1928 г. (С. З. БССР 1928 г. № 8 ст. 62)—постановляет:

1. Обязать все учреждения и предприятия, не сдавшие до сего времени принадлежащего им лома чорных металлов, немедленно реализовать его чрез акционерное общество „Рудметалторг" и на будущее время, по мере накопления лома, реализовать его тем-же порядком.

2. Поручить Народному Комиссариату Торговли БССР срочно организовать на территории республики закупку лома чорных металлов у кооперативных и общественных организаций и частных лиц по ценам, установленным Народным Комиссариатом Торговли СССР.

Закупка должна производиться сельскохозяйственной и потребительской кооперацией и государственными торгующими организациями, занимающимися сбором утилизационного сырья.

3. Порядок реализации лома устанавливается Народным Комиссариатом Торговли по согласованию с Высшим Советом Народного Хозяйства в соответствии с постановлением Совета Труда и Обороны от 6-го октября 1928 г. (пр. № 393).

Председатель Экономического Совещания при Совете Народных Комиссаров БССР М. Карклин.

Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР В. Кривицкий.

25 октября 1928 года.
г. Минск.

„ЗАПЯЮЦЬ ВЕРАЦЁНЫ"

(Прэм'ера на адчыненьні сэзону БДТІ).

Зьмест новага драматычнага твору А. Міровіча палкам з нашых дзён. Цэлая галярэя адмоўных тыпаў: «чырвоны» дырэктар ткацкае фабрыкі Галаўняк, пра якога вельмі правільна зазначыла лібрэта п'есы «Чалавек шырокага размаху і кароткага розуму"; ён нагрэз ужо ў тым махровым акружэньні, якое склалі каля яго—выразны шкодник тэхнічны [illegible] фабрыкі Рэнкоўскі, бухгальтар фабрыкі, круг сваякоў (жонка і яе матка) і знаёмых як маскоўскі дзяцел Аляксандар Іванавіч, Башкураў і іншыя. Навокал „сонцаў" рухаюцца дробныя «тыпэты" — тут старшыня фабкому Шышько, гаторы „крыць" рабочых, абы ўнаравіць начальству, тут і заядлая абортніца і прыслужніца віцэ-дырэктара работніца Навіцкая. Станоўчых тыпаў нагуч куды менш: сэкратар райкому Вагін, які з часу пяну зьбіўся на дрэнны шлях запою (а быў заслужаным баявіком—бальшавіком), практыкантка фабрыкі і рэдактар сьценгазэты Марыя Макаронак, нарэшце, работніца фабрыкі Верка, крыху неўмерканая, але шчыра і адданая абаронца Марылі, калі яроці яе ўзьняла кампанію адміністрацыі фабрыкі.

І вось на фабрыцы і каля яе ў мястачку шырока распаўзлася цьвіль, вагні леньне. Жыцьцё—што стаячае балота: дырэктар ужо аблытан «авансамі» з фабрычнае касы, каб залагодзіць сваю жонку з былых арыстакратак, сам сэкратар райкому апушчаецца з дня ў дзень, рабочая маса жыве шэра, занаўсьцядома і толькі ў хвіліны заклёку фабрыкі кіруецца клясавым інстынктам.

Але пачалося з малога—віцэдырэктар бязьлітасна абышоўся з маладою работніцаю, якая запяжарыла ад яго, сьпенгазэта, вуснамі Марылі, спрабавала выкрыць гэтае і іншыя праступкі „вярхоў" пад знакам самакрытыкі, а кончылася цэлаю навальніцаю, якая ўсё выкрыла, выратавала Марылю, выявіла ўсіх „захрыбетнікаў", вылячыла пахінулага «на чае» бальшавіка з інтэлігэнтаў—Вагіна.

А. Міровіч у гэтым сваім творы на голаву, вышэй сябе, як аўтара іншых драмат. твораў. Смелы рысунак, пагыбленая псыхалёгія, правільная ўстаноўка, упэўнены вопытны ход подзей. За вельмі малым выключэньнем дыялёг проста тэхнічны [illegible] слова ня вікінем, як кажуць. Скептыкі кажуць, што фарбы «крыху згушчаны», але-ж з нічога [illegible] відань, каб аўтар абаснаваў адмоўныя свае жыцьця. Наадварот, ні адзін з адмоўнага тыпажу не атрымаў „слова абароны" на сваю карысьць—яны ўсё ўсталі прад намі, як аголеныя. Станоўчыя тыпы дадзены авеяннымі тымі сымпатычнымі рысамі, якія пазваляюць іх асвойваць з замілаваньнем. Агульны тон спэктаклю поўны бадзёрасьці, пагыбленае эмоцыі.

П'еса паступова заваёўвала ўвагаю ўсяго паўнюсенькага тэатру, але... але-ж бяз «лыжкі дзёгцю» абыйсьціся няможна. Такі спрыянны да п'есы агульны прыхіл, умеру таго, як стрэлка гадзіньніка перайшла за поўнач, паступова таяў. Калі глядач пераваліў за момант пераараджэньня Вагіна, далей гучных воплескаў справа не пайшла—стомлены глядач ня меў ужо сіл прывітаць любімага аўтара.

Ці ўсё-ж «ідэальна» ў новай п'есе Міровіча? Канешне, ёсьць недахопы, але іх мала і яны тонуць у станоўчых баках твору. Напрыклад, для пішучага гэныя строкі вусіх „неапрэўданымі" гучаць словы Марылькі, зьвернутыя да Вагіна: «А ці-ж гэта ня фронт, Мікола Паўлавіч?» Канешне, ня трэба, каб Вагін толькі са слоў Марылькі знаходзіў «Амэрыку» ў «гаспадарчым фронце».

Пагляд'зёўшы п'есу яшчэ раз, можна будзе больш крытычна падыйсьці да новага твору Міровіча. Пакуль-жа што—трэба спэктакль навучыцца весьці без запяжных антрактаў, інакш ад гэтага церпіць п'еса, ня гледзячы на яе высокую якасьць.

Old.

АД РЭДАКЦЫІ: Друкуючы гэту рэцэнзію рэдакцыя знаходзіць, што аўтар не даўсёў да канца сваіх спроб, як сьлед прааналізаваць п'есу, а ўсю сваю ўвагу накіраваў на некаторыя станоўчыя моманты яе.

ХРОНІКА.

Водпуск Старшыні СНК т. Галадзеду

Савет Народных Камісараў пастанавіў даць Старшыні СНК тав. Галадзеду М. М. 2-хтыднёвы водпуск з 26 кастрычніка г. г. Выкананьне абавязкаў Старшыні СНК на час водпуску т. Галадзеда ўскладзена на Нам. Старшыні СНК т. Карклiна.

ПАДРЫХТОЎКА ДА СЬВЯТКАВАНЬНЯ 10-ЦІГОДЗЬДЗЯ АГАЛАШЭНЬНЯ БССР.

26 кастрычніка адбылося пасяджэньне акруговай камісіі па сьвяткаваньню 10-цігодзьдзя агалашэньня БССР. На пасяджэньні быў заслуханы даклад т. Яцкевіча аб праробленай працы па падрыхтоўцы да сьвята і зацьверджан план сьвяткаваньня.

На вёсцы пачатак сьвяткаваньня 30-га сьнежня—1 студзеня. У час сьвята адбудуцца ўрачыстыя пасяджэньні сельсаветаў, РВК сумесна з партыйнымі, прафэсыянальнымі і грамадзкімі арганізацыямі, на якіх будуць пастаўлены даклады аб утварэньні БССР і барацьбе за і ва дасягненьнях за 10 год існаваньня.

У гарадох Менску і Барысаве сьвяткаваньне будзе праходзіць з 23 сьнежня па 1 студзеня. На працягу гэтага часу таксама адбудуцца даклады, прысьвечаныя 10-цігодзьдзю агалашэньня БССР.

У Барысаве 30 сьнежня адбудзецца ўрачыстае пасяджэньне гарсавету. У Менску, у сувязі з сэсіяй ЦВК, урачыстае пасяджэньне гарсавету на будзе, а сябры гарсавету прымуць удзел у пасяджэньні сэсіі.

Ува ўсіх раённых цэнтрах 30 сьнежня пастаноўлена правесьці мітынгі-дэманстрацыі.

У Менску, у дзень адчыненьня сэсіі увечары будуць арганізаваны дэманстрацыі — прывітаньні сэсіі ЦВК, а днём адбудзецца парад Чырвонай арміі. Ад акругкому КПБ(б) АВК і саюзаў будуць выдадзены адозвы-лістоўкі на ўсіх нацыянальных мовах.

Камісія пастанавіла таксама прывесьці ў парадак могілкі барцоў за аслабаненьне БССР, як у Менску, гэтак і па раёнах.

Даручана т. Рабіновічу напісаць кнігу „Менск за 10 год нацыянальнага і культурнага будаўніцтва".

Да часу сьвята пастаноўлена выдаць шэраг адкрытак, якія будуць характарызаваць гісторыю рэвалюцыйнага мінулага і сучаснага сацыялістычнага будаўніцтва Менску.

Т. т. Рабіновічу, Ластоўскаму і Цітову даручана скласьці праект закладкі гарадзкога музэю.

Пастаноўлена назваць імем „10-цігодзьдзя агалашэньня БССР" новапабудаваную Лахаўскую сялёнку, Шацкую больніцу і Капыльскі камбінат. Урачыстае адчыненьне гэтых устаноў прыстасаваць да сьвята.

Апрача гэтага, пастаноўлена назваць імем „10-ці-годзьдзя агалашэньня БССР" Цэнтральны Дом Селяніна.

Пастаноўлена запрасіць дэлегацыі рабочых Барысаву, Віцебску і Гомелю на час сьвяткаваньня ў Менск.

Менскі дзень.

— Усебеларуская нарада па грамадзкаму харчаваньню адчынілася ў памяшканьні клюбу «Харчарч» 26-га кастрычніка. Нарада вырашыць шэраг пытаньняў, зьвязаных з паляпшэньнем грамадзкага харчаваньня ў БССР.

— 6 аўтабусаў маюць быць у хуткім часе атрыманы в Аўстрыі для Менску. Адзін аўтабус ужо атрыман гэтымі днямі.

— Культурны паход камсамолу згодна пастановы ЦК ЛКСМБ, працягваецца да 15-га сьнежня. Гэта дасьць магчымасьць улягнуць усе грамадзкія арганізацыі ў правядзеньне культпаходу.

— На 500.000 р. розных металічных тавараў назначана зьвесьці ў БССР у працягу 1-га кварталу бягучага гаспадарчага г.

— Антыалкагольныя вечары мяркуе правесьці саюз будаўнікоў у час сьвяткаваньня 11-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі.

— Адбудаваць буйны вадзяны млын каля м-кі Бярэзіна пастанавіў Менскі акрплян. На гэту мэту асигнавана 8.000 р.

— 400.000 бочак цэманту выдзелена для забясьпечаньня БССР на бягучы 1928-29 гаспадарчы год.

— Суботнік у нарысьць школы па Менскай акрузе будзе праводзіцца з 1 па 15 сьнежня г. г.

У час суботніка будуць арганізоўвацца атрады сталяроў, сьлесароў і інш. для рамонту школ.

— Акруговая канфэрэнцыя «Озэту» склікаецца на 10 лістапада. На канфэрэнцыі будуць заслуханы даклады аб працы менскага і беларускага «Озэту».

— Магілёўскі працкалектыў скурнікаў перадаецца беларускаму скураному трэсту.

— Перавыбары бюро камсамольскіх ячэек па Менскай акрузе пачнуцца з 11 лістапада г. г.

— Вячэрні тэхнікум па падрыхтоўцы піанэрпрацаўнікоў у Менску адчыніцца 15 лістапада. У тэхнікум будзе прынята 70 піанэр-працаўнікоў.

Падрыхтоўка да Кастрычніка-вага сьвята.

Гэтымі днямі адбылася шырокая нарада культкамісій групкомаў і мясцкомаў саюзу працасьветы. Нарада абгаварала і зацьверджала план сьвяткаваньня II-й гадавіны Кастрычніка.

Вырашана напярэдадні сьвята правесьці цыкль лекцый пры Доме Асьветы на тэмы: Кастрычнік у школе, Кастрычнік у літаратуры і ў музыцы і 6 лістапада адбудуцца сямейныя вечары па ўсіх групкомах і мясцкомах. 7-га ўвечары ўрачысты сход членаў саюзу ў Доме Асьветы; 8-га для дзяцей членаў саюзу ранішнік, а ўвечары пастаноўка для юнсэкцыі.

У час сьвята 11-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі ў дзіцячых домах Менскай акругі будуць наладжвацца дзіцячыя ранішнікі, спэктаклі, на якія будзе запрошана акаляючае сялянства.

7-га і 8-га лістапада дзецям будзе выдаваецца падвойны паёк. На гэту мэту будзе выдаткавана звыш 600 р.

Апрача гэтага, усім выхаванцам дзіцячых дамоў Менскай акругі будуць выданы новыя вопраткі.

Падарунак да сьвята.

За рахунак ороднаў палапшэньня быту пры Белдзяржкіно да дню Кастрычнікавага сьвята прыўрочваецца адчыненьне дзіцячага саду на 25 дзяцей. Сад будзе абслугоўваць дзяцей-працаўнікоў Белдзяржкіно. На арганізацыю і утрыманьне дзіцячага саду адпушчана 2700 руб.

2 новыя клюбы.

Па саюзу дрэваапрацоўчнікаў у час сьвяткаваньня будуць падводзіцца вынікі гаспадарчых дасягненьняў па асобных прадпрыёмствах. Сямейныя вечары па ўсіх фабзавуцах будуць насіць выключна культ[illegible] характар. Гэтыя вечары будуць наладжвацца як для рабочых, так і для іх утрыманцаў.

К дню сьвята прыўрочваецца адчыненьне новага клюбу ў Гомелі і адчыненьне клюбу ў Бабруйску.

Калі будзе адчынен новы Дом Селяніна.

Раней меркавалася, што адчыненьне Цэнтральнага Дому Селяніна адбудзецца ў час сьвята Кастрычнікавай рэвалюцыі. Прымаючы пад увагу, што абсталяваньне Дому яшчэ на скончана, ёсьць думка, што ён будзе адчынен для сялянства спачатку сьнежня, а ўрачыстае адчыненьне адбудзецца ў дзень юбілею дзесятай гадавіны агалашэньня БССР.

Зараз у Доме Селяніна праводзіцца арганізацыя с.-г. музэю, які па багацьцю і разнастойнасьці экспанатаў будзе насіць характар Цэнтральнага Беларускага Сельска-Гаспадарчага Музэю. Музэй падзяляецца на 10 аддзелаў і будзе разьмешчаны ў 10-ці пакоях. Мяркуецца адчыніць наступныя аддзелы: земляробства, мэліярацыі і культуртэхнікі, лясны, сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі, па пераапрацоўцы прадуктаў сельскай гасп. і інш. Апрача ранейшых экспанатаў, рыхтуюць [illegible] экспанаты наступныя ўстановы: Белсельтрэст, Белсельсаюз, Дасьледчыя станцыі, ГЭТ, Дзяржгандаль, аддзел рыбаводзтва Нарыамзему і інш. арганізацыі. Абслугоўваньне музэю будзе ўскладзена на 2-х аграномаў, якія будуць даваць тлумачэньні сялянству.

Белсельсаюз прыцягваецца да адказнасьці.

Не зважаючы на шэраг распараджэньняў і тэлефонаграм, праўленьне Белсельсаюзу дагэтуль не прадставіла зьвестак па вучоту кантрактацыі насеяў азімага жыта. Між тым гэтыя зьвесткі былі патрэбны для прадстаўленьня ў Саюзны Наркамгандаль.

Наркамгандалю БССР пастанавіў перадаць справу ў пракуратуру для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

Аб'яднаньне мэталёзаводаў.

Да кастрычнікавых сьвят завод „Мэталь", сельска-гаспадарчыя майстэрні імя Бурбіса і завод «Усход» будуць аб'яднаны ў адзін завод. Аб'яднаному заводу будзе надана імя „Камунар". На аб'яднаным заводзе будзе працаваць 450 рабочых.

Мэтадычныя лекцыі па радыё.

Культаддзел ЦП саюзу працаўнікоў асьветы праводзіць цыкль лекцый па радыё. Лекцыі будуць прачытаны на тэмы: антырэлігійнае выхаваньне ў школе, піанэр-праца ў школе і настаўнік, інтэрнацыянальнае выхаваньне, палавое выхаваньне ў школе і інш.

Частка лекцый ужо адбылася.

Для чытаньня лекцый запрошаны лепшыя педагагічныя сілы гораду Менску.

Скончыўся ўсебеларускі конкурс на лепшую латыскую калёнію.

Скончыўся ўсебеларускі конкурс на лепшую латыскую калёнію.

У конкурсе прымалі ўдзел каля 20 латыскіх калёній. Лепшымі прызнаны 7 латыскіх калёній, у якіх мяюцца дасягненьні як у гаспадарчых, так і культурных адносінах.

З гэтай колькасьці калёнія Вацлаваўская (Полацкая акруга), Віцерскай (Бабр. акруга), Рудзіноўцы і Галіч—Міза (Магілёўск. акруга) на пастанове конкурсай камісіі будуць выдадзены радыёпрыёмнікі з гучна-гаварыцелямі, а калёніям Ховаўская (Магілёўск. акруга), Барсеўская (Віцебская акруга) і Белая (Полацкая акруга) будуць выданы бібліятэчкі. Выдача гэтых прэмій прыстасоўваецца да часу Кастрычнікаўскіх урачыстасьцяў.

Удзел ТДА-Авіяхіму ў зборы жалезнага і чыгуннага лому.

ЦС ТДА-Авіяхіму БССР зьвярнуўся да ўсіх арганізацый і сяброў ТДА-Авіяхіму аб неабходнасьці прыняцьця актыўнага ўдзелу па зборы жалезнага і чыгуннага лому. Сабраны чыгунны і жалезны лом павінен быць здадзен на мясцох „Рудметалёторгу". Выручаныя сродкі павінны пайсьці выключна на ўзмацненьне працы ячэек ТДА-Авіяхіму.

Карэктары-вандроўнікі.

— Вось цікава,—падумае чытач,—прачытаўшы загаловак. І адкуль гэта яны прышлі? А мо' іх маршрут супадае з «кругасьветнымі вандроўнікамі», аб справе якіх друкавалася ў «Сав. Беларусі» ад 18-X 1928 г.

Не, мылнецеся. Карэктары—самыя звычайныя, што працуюць у 1-й дзярждрукарні—газ. „Сав. Бел." і «Акцябр», а чаму вандроўнікі, дык такі, бачыце іх ужо ёсьць.

Вандруюць яны па ўсіх пакоях друкарні, шукаюць прытулку, каб схавацца ад таго гармідару, які панае ў карэктарскім пакоі, дзе робіцца такая адказная праца, як чытка карэктуры, асабліва гатэтная.

Ніхто не зьвяртае ўвагі. Загадчык друкарні раіць сесьці ў яго на стале і чытаць, фабком—запрашае к сабе ў лепкуток (амаль у другі будынак), а камісія аховы здароўя—вы думаеце цікавіцца? Не, прапануе: «як-небудзь» і «дзе-небудзь», а там... там, можа, што-небудзь будзе.

Артыкулы, зьмешчаныя ў газэтах аб працы пакаванай карэктарскай, не кранулі ўвагі ні Выдавецтва, ні друкарні. Кажуць, што чыталі... і на тым канец.

Як і раней,—гам. Як і раней—штодня шукаць трэба месца, крэсла, асадкі і інш. Як і раней—знаходзішся пад пагрозай пропуску, скажэньня сказу і недарэчнасьці, якія могуць адарыцца штодня.

Хто дапаможа—невядома. Няўжо так і будзе?

К—ры.

Пашырэньне працы калектываў Менску.

Менскае акруговае кіраўніцтва выпрацавала плян пашырэньня працкалектываў Менску. Па гэтаму пляну ў бягучым гаспадарчым годзе прадугледжваецца пашырыць працкалектыў «Тэкстыльшчык» на 125 чал. з вышпрацоўкай прадукцыі на суму 767000 руб. На гэтае мерапрыёмства будзе выдаткавана 40000 руб. Кантынгент пражы ўжо вызначан у колькасьці 5200 руб., што здавальняе патрэбнасьць гэтага працкалектыву. Апрача гэтага мае быць пашыран працкалектыў пашачнікаў да 850 чал. (зараз працуюць 325 чал.). Для гэтай мэты ўжо пабудавана фабрыка. На гэтае мерапрыёмства патрабуецца 300000 руб.

Механізацыя працкалектываў.

На днях з Нямеччыны праз Управу Дзяржгандлю БССР атрыманы 4 брусавальныя машыны для менскага працкалектыву па выпрацоўцы абутку.

Апрача гэтага, атрыманы з Амэрыкі 2 электрычныя закройныя машыны для працкалектываў швэйнікаў у Менску і Барысаве.

Провады прызыўнікоў.

Сёньня ў Доме Асьветы гарайкомам ЛКСМБ наладжвае ўрачыстыя провады прызыўнікоў. У [illegible] гадзіны [illegible] гадзіны ўкраінскага камсамолу, якая прыехала для сумеснага сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя ЛКСМ.

Прызыўнікам будуць разданы падарункі наладжана пастаноўка.

У зоолёгічным музэі.

28 кастрычніка адчыняецца выставачны аддзел зоолёгічнага музэю Беларускай Акадэміі Навук.

За летні час выставачны аддзел папоўніся новымі экспанатамі. Трэба адзначыць вельмі цікавую біолёгічную вітрыну, якая малюе сустрэчу ваўка і рысі. Выстаўлена калекцыя зьвяроў—альбіносаў.

Выставачны аддзел музэю адчынен па нядзелях з 11 да 2 гадзін дню і па чацьвярох з 11-й да 2-й гадзіны. Уваход вольны.

Будаўнічыя матар'ялы для БССР.

Стройсындыкат вызначыў завесьці ў БССР на кастрычнік месяц на 81.600 руб. будаўнічых матар'ялаў.

З усіх колькасьці цэменту партландзкага назначана завесьці 11.000 бочак, азбестру—18 тон, ванны—60 тон і мелу—25 тон.

Забясьпечаньне будаўнікоў на зіму працай.

У бягучым годзе на будаўнічых работах узімку будуць працаваць 500 рабочых будаўнікоў.

З гэтай колькасьці на пабудове Гандальстрою будуць заняты 200 рабочых на пабудовах Белдзяржстрою—300 рабочых. Гэта дасьць магчымасьць забясьпечыць будаўнікоў на зіму працай і закончыць начатыя будаўнічыя работы.

Паштовая скрынка.

Настаўніку Цыбулькіну.—Служба ў старой арміі ў стаж для атрыманьня пенсіі за 25 гадоў настаўніцкай працы не залічваецца.

У ЦБ „МАЛАДНЯКА".

Падрыхтоўка да кастрычнінаўскіх урачыстасьцяў.

ЦБ «Маладняка», сумесна з нацыянальнымі сэкцыямі пралетарскіх пісьменьнікаў пачало рыхтавацца да 11-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі.

У час сьвята мяркуецца правесьці інтэрнацыянальны літаратурны вечар. На вечары адбудзецца чытка твораў пісьменьнікаў на нацыянальных мовах.

5-годзьдзе «Маладняка».

28 лістапада спаўняецца 5-я гадавіна існаваньня «Маладняка». Юбілею будзе прысьвечана адно ўрачыстае пасяджэньне зьезду „БелАПП'а" (Беларуская Асацыяцыя Пралетарскіх Пісьменьнікаў), які распачнецца 25 лістапада. На гэтым урачыстым пасяджэньні будзе заслуханы даклад аб творчасьці «Маладняка» за 5 год.

Апрача гэтага, 5-годзьдзю прысьвечана [illegible] на юбілейны нумар часопісі «Маладняк» (№ 11).

[illegible] экскурсіях і Менску будуць праведзены літаратурныя вечары, прысьвечаныя [illegible] лею.

Арганізацыя літаратурных вечароў.

У працягу лістапада м-ца менская філія «Маладняка» мае правесьці шэраг літаратурных вечароў.

На гэтых вечарох адбудуцца даклады аб творчасьці «Маладняка» і чытка твораў маладнякоўцаў.

Чарговыя задачы КСУ.

НАРАДА СТАРШЫНЬ РАЙЁННЫХ КСУ.

Гэтымі днямі закончылася нарада старшынь райённых камітэтаў сялянскай узаемадапамогі. Нарада абмяркоўвала пытаньні аб становішчы і далейшых задачах сялянскіх к-таў узаемадапамогі ў парадку выкананьня пастановы 3-й сэсіі ЦВК БССР УШ скліканьня.

Нарада пастанавіла, што к-ты сялянскай узаемадапамогі павінны прыняць чынны ўдзел у перавыбарах саветаў і каапэрацыйных арганізацый, вылучаючы на кіруючую працу актыўных батракоў, беднякоў, якія правялі сябе на рабоце сялянскае ўзаемадапамогі.

Далей нарада ўхваліла выканаць поўнасьцю дырэктывы па рэалізацыі 2-й назыкі індустрыялізацыі, прыняць актыўны ўдзел у кампаніі хлебазагатовак узмацніць працу па каапэраваньні бедноты.

Першачарговай задачай к-таў у сучасны момант павінна зьяўляцца спагнаньне сяброўскіх узносаў і запазычанасьці. Ад выкананьня гэтай задачы будзе залежаць і далейшы посьпех у працы сялянскіх к-таў узаемадапамогі. Таму сельскія і райённыя камітэты павінны правесьці кампанію па спагнаньню сяброўскіх узносаў і запазычанасьці. Кампанію гэту трэба правесьці ва ўсіх раёнах з 1-га лістапада па 1-е сьнежня.

Другой задачай павінна быць падрыхтоўка да чарговай вясеньняй сяўбы, дзяка чаго РКСТУ і СКСТУ трэба зараз-жа прыступіць да пашэньня насенных фондаў з такім разьлікам, каб фонд кожнага РКСТУ быў папоўнен у сярэднім да 1000 пуд., а СКСТУ павінны павялічыць свае насенныя фонды ад 150 да 200 пуд.

Асаблівую ўвагу ў далейшай працы сялянскае ўзаемадапамогі нарада зварачвае на аказаньне дапамогі і ўзаемадапамогі вясковай беднаце, сем'ям чырвонаармейцаў, інвалідам вайны, былым чырвоным партызанам і іх сем'ям, адзінокім жанчынам бядняцкім праз прапоўныя дружыны і ўвогуле выкарыстаньне дадзеных дзяржаўнай ільгот беднаце і крэдытаў.

Сельскім і райённым камітэтам запропанавана зьвярнуць асаблівую ўвагу на дапамогу вучням бядняцкіх гасподарстваў, шляхам закупкі падручнікаў, абутку і адзеньня. Апроч гэтага трэба лабіяваць для бядняцкіх і батрацкіх дзяцей месц у школах.

СУД.

Бацькі—забойцы.

Грамадз. пасёлку Стары Капыль, Капыльскага райёну Мікалай Есьман атрымаў зямлю і пачаў весьці гаспадарку. Есьман быў халасты, іншых членаў сям'і ня меў і адзін працаваць на гаспадарцы ня мог, наняў работніцу Алесю Масілевіч.

Былі выпадкі, калі да Алесі Масілевіч прыходзіла старэйшая сястра яе Уляна, Мікалай Есьман запікаўся Улянай.

Ішлі месяцы. Уляна Масілевіч заняжарыла, на вёсцы пайшлі чуткі, што Мікола Есьман будзе хутка жаніцца на Уляне.

Не спадабаліся такія байкі Есьману.

З мэтай пазбавіцца ад аліментаў Есьман некалькі разоў прапанаваў Уляне зрабіць аборт, даваў на аборт грошы, але Уляна не згажалася і жадала мець дзіця і ў сваю чаргу прасіла Есьмана хутчэй зарэгістраваць шлюб.

Перад радамі Есьман забраў да сябе Уляну і сказаў, што жэніцца з ёй тады, калі дзіця яна зьнішчыць, у чым абяцаў дапамагчы. Уляна згадзілася.

Ночу 27 лістапада 1927 г. Уляна нарадзіла дзіця, вынесла яго на двор і закапала ў сьнег.

Менскі акруговы суд прыгаварыў: Мікалая Есьмана і Уляну Масілевіч на восем год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем, але прымаючы пад увагу малады ўзрост, першую судзімасьць і некультурасьць, суд скараціў пакараньне—Есьману да 5 год, а Масілевіч да 3 год з суровым адмежаваньнем.

К.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

За кражу быка.

Грамадз. вёскі Бабарыкі Халопеніцкага райёну браты—Рыгор і Захар Позьнікі 12 мая г. г. укралі племяннога быка, які належаў гр. вёскі Каменка.

Нарсуд Халопеніцкага райёну, на аснове 180 п. в. арт. К. К. прыгаварыў: Рыгора і Захара Позьнікаў па восем год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем, пазбаўленьнем у правах на тры гады і высылкай на адбыцьці пакараньня в Менскай акрузе на 49 арт. К. К. на пяць год.

Каапэратар-растратчык.

Загадч. мануфактурнага аддзяленьня Халопеніцкага Спажывецкага таварыства Амэльян Скалубовіч з 1 кастрычніка 1927 г. па май месяц 1928 году растраціў мануфактуры і грошай на 405 р. 51 к.

Нарсуд Халопеніцкага райёну прыгаварыў Амэльяна Скалубовіча на адзін год і 3 месяцы зьняволеньня з суровым адмежаваньнем і спагнаньнем з яго, Скалубовіча, на карысьць спажывецкага таварыства 405 р. 51 к.

Апавяшчэньні.

Нарада па пытаньнях гаспадарчага становішча.

У панядзелак, 29-га кастрычніка, у 7 гадзін вечара (у памяшканьні клюбу Карла Маркса, у залі пасяджэньняў) адбудзецца інструкцыйная нарада па пытаньнях гаспадарчага становішча. Дакладчык тав. Славінскі—сэкратар акругкому.

Яўка т. т., выдзеленых дакладчыкамі, абавязкова.

СЬПІС ТТ., ВЫДЗЕЛЕНЫХ ДАКЛАДЧЫКАМІ АБ ГАСПАД. СТАНОВІШЧЫ

Стракоўскі (ВСНГ), Міленькі (дырэктар Харчтрэсту), Ізраіліт (дырэктар Белпайгандалю), Ярофеяў (Лесбел). Цапкаваты (электрастанцыя), Гарбуноў (завод «Восход». Заранкін (Кіраўніцтва Працкалектываў), Фрэйдзін (Гарбарні), Палякоў (Белдзяржшрэт), Равіч (Дзяржстрой), Макарэвіч (Менсельпром), Дзячкоўскі («Торгстрой») Луцкевіч (Белпайгандаль), Блюмкін (ВСНГ), Жук (Праўленьне Працкалектываў), Кац (Праўленьне МЦРК), Шэйнін (Белдзяржгандаль), Холад (Наркамгандаль), Адамайціс (Наркам Унутранага Гандлю), Цофін (Наркамгандаль), Грынскі (Наркам Унутранага гандлю), Рубенчык (Тэкстыльтрэст), Ліхадзеўскі (Шчацінны трэст), Капароўскі (Лесбел), Лодзіч (завод «Беларусь»), Лабанаў (завод «Пролетарый»), Яцкевіч (завод „Варшаванка"), Рубін (Сьпіртазавод), Найхім (Праўленьне Цэнтрасьпірту). Брэнн (завод Дрэваапрацоўчнік), Раськін (ЦК Саюзу Харчавікоў), Іваноў (ЦК Мэталістаў), Платун (ЦК Саюзу Наркамасьветы), Каплан (ЦСПСБ), Розін (ЦСПСБ). Ісаеў (ЦСПСБ), Яцкевіч (Акрвыканком), Кроль (Нач. міліцыі), Рабіновіч (Гарсавет), Валасеў (АВПП), Васкабойнікаў (Камбанк), Ашэровіч (газэта „Октябрь"), Зысман (Акруговая Пракуратура), Сташэўскі (Наркам'юст), Шукевіч (газэта „Беларуская Вёска"), Пазэранец (Акругком КП(б)Б), Тамашэўскі (Акругком КП(б)Б), Палякоўскі (Акругком КП(б)Б), Вольковіч (Ляхаўскі Райком КП(б)Б). Гурэвіч (Гарадзкі Райком), Вагін (ДПУ), Левін (Белжылсаюз), Зедзічонак (МЦРК), Гравіт (Наркам Працы), Зельдовіч („Куст-промсаюз"), Наўлянскі (Белкаапсаюз), Цырлін (Белкаапсаюз), Мар'ясін (Белкустпромсаюз"), Хаскін (БКС), Агранаўскі (Белкаап